

ПАРТЫЗАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ. І МІЛІЦЭЙСКІМІ... **3**



БЕЛАРУСКІ ТЭАТР ГЛЯДЗІЦЬ У ЗАЎТРА **6**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
21 МАЯ 2022 г. СУБОТА
№ 98 (29720)

З першых вуснаў

# «НІДЗЕ ТАК, ЯК У БЕЛАРУСІ, НЕ ЗАХАВАЛІСЯ ПІЯНЕРСКІЯ ТРАДЫЦЫІ»

### Прэзідэнт Беларусі на сустрэчы з піянерскім актывам расказаў пра сваё дзяцінства, дэвіз па жыцці і даў важную параду ўсім маладым беларусам



Фота БелТА.

**Нагода сустрэчы ў Палацы Незалежнасці — векавы юбілей піянерскага руху, аднаго з самых масавых дзіцячых аб'яднанняў краіны. Сёння Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя налічвае амаль 625 тысяч чалавек. На размову з Аляксандрам Лукашэнкам запрошаны 70 найлепшых з іх — прадстаўнікі кіраўніцтва арганізацыі, фіналісты і пераможцы разнастайных піянерскіх конкурсаў і гульняў. Ім выпала рэдкая магчымасць задаць кіраўніку краіны пытанні і расказаць пра свае мары і планы.**

«Вы стаіце каля вытокаў адраджэння піянерскай арганізацыі. У мяне пачуццё такое, што мінулы і гэты гады ў нас будуць вельмі актыўныя сярод нашай моладзі — «камсамольскай» арганізацыі (БРСМ) і ў вас, піянераў. Самымі актыўнымі будуць гэтыя гады. Вы каля вытокаў, у пачатку адраджэння», — сказаў Прэзідэнт.

Ён успомніў свае дзіцячыя і юнацкія гады, якія прыйшліся на росквіт піянерскага і камсамольскага руху, сваю дзейнасць у арганізацыях і назваў піянерскія гады самымі шчаслівымі ў дзяцінстве. «Я не сказаў бы, што мы вельмі весяліліся. Так, мы жылі бесклапотна. Спорт быў у жыцці з раніцы да вечара, калі ты быў свабодны ад працы, бо ў вёсцы яе было шмат, — расказаў кіраўнік краіны. — Я працаваў у сельскай гаспадарцы — не толькі маці дапамагаў, а працаваў самастойна, каб зарабіць нейкія грошы».

Па словах Прэзідэнта, належыць сур'ёзна адбудаваць работу піянерскай і маладзёжнай арганізацый у Беларусі. Ён адзначыў, што самы істотны недахоп у тым, што піянерская арганізацыя слаба прывязана да БРСМ. «З піянераў расцілі новае пакаленне моладзі. У нас яшчэ слаба з гэтай справай. Мы тут вінаватыя. Без БРСМ, камсамолу, проста кажучы, мы страцім піянерскую арганізацыю. Ні адна ўлада з гэтым не справіцца, — дадаў кіраўнік краіны. — Я думаю, мы адбудуем гэту сістэму. Яна павінна быць не горшай, чым у тыя часы. Тады ў нас будзе дастаткова патрыётаў і не будзе стаяць пытанне патрыятызму».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў дзяцей зацікаўліваць піянерскім жыццём сваіх пагодкаў, бацькі якіх выступаюць супраць удзелу дзяцей у дзіцячым руху. «Неабходна гэтых дзяцей прыцягваць да сябе. Па прычыне таго, што бацькі ў іх такія, не трэба з іх кпіць, прыніжаць. Іх неабходна прыцягваць да сябе», — заклікае Прэзідэнт.

«Вельмі важна, што нідзе так, як у Беларусі, не захаваліся піянерскія традыцыі. Піянерскія і камсамольскія арганізацыі на постсавецкай прасторы цалкам разбураны. Яны замененыя іншымі формамі для рэкламы, для адчэпнага. Мы захавалі сваю піянерскую арганізацыю», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, сустрэча з дзецьмі — яшчэ і сігнал для грамадства, што Прэзідэнт бачыць піянераў у жыцці грамадства.

Аляксандр Лукашэнка выказаў думку: для таго, каб моладзь імкнулася ўступіць у маладзёжны рух, неабходна яе загрузіць такой работай, якая будзе значная для жыцця маладых людзей па прыкладзе савецкіх часоў.

«Неабходна павялічваць значэнне камсамольскіх арганізацый. І над гэтым неабходна працаваць, — акцэнтаваў кіраўнік краіны. — Мы павінны адбудаваць структуру і, самае галоўнае, пазбавіцца фармалізму. Трэба ад гэтага сысці і зрабіць так, каб піянерская і камсамольская арганізацыі былі прыцягальныя для моладзі. Вось наша задача».

СТАР. 2

**Адразу пасля сустрэчы з піянерскім актывам, як перадае БелТА, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю. Плануецца, што ў Сочы адбудуцца перагаворы кіраўніка краіны з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Аб гэтай поўнафарматнай сустрэчы лідары дамовіліся на саміце АДКБ. Кіраўнікі краіны падрабязна абмяркуюць увесь спектр тэм беларуска-расійскага супрацоўніцтва, ход выканання ўрадамі раней дадзеных даручэнняў.**

У цэнтры ўвагі

## Наталля КАЧАНАВА: «Тое, што робіць завод грамадзянскай авіяцыі, заслугоўвае самай высокай пахвалы»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала ўчора ААТ «Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі № 407». Яна пазнаёмілася з дзейнасцю прадпрыемства, яго музейнай экспазіцыяй і сустрэлася з працоўным калектывам. Сёння завод спецыялізуецца на капітальным рамонце самалётаў ТУ-134, Як-40, ЯК-42, а таксама выконвае тэхнічнае абслугоўванне паветраных суднаў ІЛ-76. На прадпрыемстве працуе 746 чалавек.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Прыёмная кампанія — 2022

## Трымаць руку на пульсе

### Як рыхтуе інжынераў заўтрашняга дня галоўны тэхнічны ўніверсітэт краіны

**«У Беларусі сёння няма ніводнага прадпрыемства, дзе б ні працавалі выпускнікі БНТУ. А патрэба ў інжынерных кадрах у краіне настолькі вялікая, што падчас размеркавання выпускнікоў мы не можам задаволіць усе заяўкі ад наймальнікаў», — канстатаваў падчас сустрэчы з журналістамі першы прарэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Георгій ВЯРШЫНА.**

НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

— Я лічу, што кожнае новае пакаленне лепшае за папярэдняе: маладыя ведаюць больш за нас і глядзяць далей. А прыёмная кампанія — найважнейшае мерапрыемства, калі вырашаецца лёс маладых людзей. І мы павінны дапамагчы ім зрабіць правільны выбар. Толькі ў нашым універсітэце за дзесяць апошніх гадоў адкрылася 50 новых спецыяльнасцяў, — расказаў Георгій Вяршына. — Заўважу, што на пустым месцы спецыяльнасць не адкрываецца. Гэтаму папярэднічае цэлая эпапея: спачатку ідуць фундаментальныя даследаванні, ажыццяўляецца нейкі значны стартап-праект. Далей — прыкладныя даследаванні. Новую спецыяльнасць адкрываем, толькі калі маем тры складнікі: наяўнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы, навуковай школы і інфармацыйнага забеспячэння. Імкнёмся трымаць руку на пульсе, і ўсе спецыяльнасці, якія патрабуюцца рынку працы, абавязкова адкрываем.

СТАР. 2

Героі

## Назаўжды ў мірным небе

### У Баранавічах адкрылі мемарыял Героям Беларусі Андрэю Нічыпорчыку і Мікіту Куканенку




Фота БелТА.

**Год таму амаль усе беларусы перажывалі трагедыю лётчыкаў, якія загінулі ў Баранавічах. 19 мая 2021 года падчас трэніровачных палётаў вучэбна-баявы самалёт Як-130 страціў кіраванне і пацярпеў крушэнне. Пілоты 116-й гвардзейскай штурмавой авіябазы не катапультаваліся...**

Яшчэ да таго, як следства вынесла вердыкт, было зразумела: лідскія лётчыкі маёр Андрэй Нічыпорчык і лейтэнант Мікіта Куканенка здзейснілі подзвіг. Відавочцы падзеі сведчылі: некіруемы самалёт, які падаў на жылыя дамы, у долі секунды памяняў свой маршрут — Як-130 прызямліўся на невялічкім лапіку зямлі. Толькі дзякуючы прафесійным дзеянням экіпажа, ахвяр сярод мірных жыхароў удалося пазбегнуць. За мужнасць і гераізм пры выкананні воінскага абавязку Указам Прэзідэнта лётчыкам пасмяротна прысвоена высокае званне «Герой Беларусі».

— Яны зрабілі свой выбар і цаной уласнага жыцця выратавалі сотні людзей на зямлі. Самаахвярным учынкам упісалі свае імёны ў гісторыю нашай дзяржавы, пакінуўшы яркі след. Яны сталі ў адзін шэраг з тымі людзьмі, якіх мы шануем, памятаем, якімі ганарымся, — адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця помніка **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.**

Па словах кіраўніка абароннага ведамства, імёнамі Андрэя і Мікіты называюцца піянерскія дружыны, іх будуць насіць вуліцы ў гарадах: «Пакуль на нашай зямлі нараджаюцца такія людзі, пакуль у нашай арміі служаць такія ваеннаслужачыя, у нашай краіны ёсць будучыня і яе ёсць каму абараняць».

Па словах памочніка Прэзідэнта — **інспектара па Брэсцкай вобласці Валерыя ВАКУЛЬЧЫКА,** гэты подзвіг стаў магчымым перш за ўсё дзякуючы выхаванню ў сям'і, школе, Ваеннай акадэміі, дзе вучыліся, там, дзе потым служылі: «У выніку мы атрымалі сыноў, патрыётаў сваёй краіны, сапраўдных мужчын».

Як адзначыў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА,** 26 гадоў таму на Брэстчыне, таксама ў Баранавічах, Уладзімір Карват стаў першым Героем Беларусі, які ўжо тады паказаў, што такое лётчык, Радзіма, бяспека і людзі вакол цябе. «Год таму два маладыя афіцэры паўтарылі подзвіг Карвата. Яны бачылі горад, разумелі, што адбываецца з машынай, прымалі рашэнне — няхай жывуць людзі».

Кампазіцыя мемарыяла сімвалізуе ўлюбёных у неба прафесіяналаў сваёй справы, сапраўдных патрыётаў, верных прысязе афіцэраў. Аўтар ідэі памятнага знака — маёр Аляксандр Чарнышоў, які служыў у 61-й знішчальнай авіяцыйнай базе. Над стварэннем скульптурнай кампазіцыі працаваў калектыў з супрацоўнікаў баранавіцкага філіяла ААТ «Брэстпраект», Баранавіцкай гарадской ЖКГ і «Баранавічырамбуда» пад кіраўніцтвам архітэктара горада Віталя Палуянчыка. Каваныя жураўлі — работа майстра Мікалая Траяновіча.

**Бацька Героя Беларусі Уладзімір НІЧЫПОРЧЫК** падзякаваў людзям за памяць, асаблівыя словы ўдзячнасці выказаў тым, хто ад ідэі да яе ўвасаблення стварыў помнік: «Кранальнае мерапрыемства, якое выклікае пачуццё болі і смутку і ў той жа час гонару за нашых сыноў».

Мясцовая жыхарка Зінаіда Кажына ніколі не забудзе той дзень, калі здарылася трагедыя. «Я пайшла ў хлеў, — успамінае жанчына. — Чую, ляціць самалёт. Ды так моцна, што з ног збівае. Потым як ухнула. Выскачыла — дым. Сусед сказаў, што за хатай самалёт узарваўся і гарыць. Жудасная была карціна...» У першыя дні пасля трагедыі на месцы авіякатастрофы быў створаны стыхійны мемарыял. І менавіта дзякуючы Зінаідзе Канстанцінаўне гэтае месца заўсёды было дагледжана. За гэты час яна парадніласа са сваякамі загінулых лётчыкаў. «Яны мне ўжо як дзеці, унукі», — прызнаецца жанчына.

Многія беларусы вельмі блізка да сэрца ўспрынялі гэтую трагедыю. Аб гэтым сведчыла і вялікая плынь людзей, якая несла кветкі да помніка Героям Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітай выступіў за пашырэнне БРІКС



Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў КНР Ван І падчас свайго выступлення на сустрэчы кіраўнікоў МЗС БРІКС (Бразілія, Расія, Індыя, Кітай, ПАР), паведаміла ТАСС. Адзначаецца, што Кітай прапануе вывучыць стандарты і працэдуры пашырэння і паступова сфарміраваць кансэнсус. Ван І падкрэсліў, што гэта дазволіць паказаць адкрытасць краін БРІКС, павялічыць іх сусветны ўплыў і будзе садзейнічаць міру і развіццю ва ўсім свеце. Кіраўнік МЗС КНР таксама дадаў, што краінам, якія ўваходзяць у арганізацыю, трэба ўмацоўваць стратэгічную камунікацыю і супрацоўніцтва, дэманстраваць прыклад узаемнага палітычнага даверу і служыць узорам ажыццяўлення прынцыпу «сіла — у адзінстве». Напярэдадні старшыня КНР Сі Цзіньпін заявіў, што краіны БРІКС павінны садзейнічаць стабільнасці міжнародных адносін у эпоху турбулентнасці. У сваім відэазвароце ён таксама падкрэсліў, што, знаходзячыся перад тварам цяперашніх рызык і выклікаў, вельмі важна ўмацоўваць супрацоўніцтва з краінамі, якія развіваюцца, і рынкамі.

### У Аўстраліі выявілі першы выпадак заражэння чалавека воспай малпаў

Захварэлага выявілі ў штаце Новы Паўднёвы Уэльс, паведаміла ТАСС са спасылкай на рэгіянальнае Міністэрства аховы здароўя. Першым на кантыненце носьбітам віруса воспы малпаў стаў 40-гадовы мужчына, які вярнуўся некалькі дзён таму з паездкі ў Еўропу. Ён звярнуўся да медыкаў з сімптомамі, якія сведчаць аб заражэнні воспай малпаў. Тэрмінова былі праведзены аналізы, якія пацвердзілі дыягназ. Пацыента і членаў яго сям'і ізалявалі. Як адзначыла галоўны санітарны ўрач штата Кэры Чант, хвароба не з'яўляецца для Аўстраліі эндэмічнай, тым не менш выпадкі заражэння часам выяўляюць у людзей, якія вярнуліся з некаторых афрыканскіх краін. Сёлета ўвесну ў Еўропе было зарэгістравана незвычайна вялікая колькасць выпадкаў заражэння людзей воспай малпаў — больш за 40 інфіцыраваных у Іспаніі і Партугаліі. Нядаўна выпадкі былі выяўлены ў Вялікабрытаніі і ЗША. Як паведаміла газета Telegraph, Сусветная арганізацыя аховы здароўя склікала надзвычайную сустрэчу экспертаў для абмеркавання ўспышкі воспы малпаў.



### У Германіі на аўкцыёне Sotheby's за $142 млн быў прададзены рарытэтны Mercedes-Benz



Аўтамабіль Mercedes-Benz 300 SLR 1955 года выпуску пайшоў з малатка за рэкордную суму, паведаміла Bloomberg. Старшыня праўлення Mercedes-Benz Ола Каленіус пацвердзіў, што аўкцыён прайшоў у музеі кампаніі ў Штутгарце. Гэтая здзелка пабіла рэкорд 2018-га, калі на аўкцыёне Sotheby's за 48,4 мільёна долараў быў прададзены Ferrari 250 GTO 1962 года. Атрыманыя грошы ад продажу аўтамабіля пойдуць у фонд Mercedes-Benz Fund, які будзе вылучаць таленавітай моладзі стыпендыі ў абласцях, звязаных з інжынерыяй, матэматыкай і навукай. Як вядома, аўтамабіль Mercedes-Benz 300 SLR — адзін з двух прататыпаў, распрацаваных у 1955 годзе гоначным аддзелам кампаніі на чале з Рудольфам Уленхаўтам, і лічыцца адным з найлепшых узораў аўтамабільнай інжынерыі і дызайну.

## КОРАТКА

- **Нацбанк падрыхтаваў праект закона па комплекснай карэкціроўцы Банкаўскага кодэкса.**
- Фура з 28 тонамі швейцарскага шакаладу з'ехала ў кювет у Полацкім раёне.
- **БНТУ заваяваў найвышэйшую ўзнагароду навуковага конкурсу ў Санкт-Пецярбургу.**
- КДК: завышэнне цэн устаноўлена ў кожным другім правераным гандлёвым аб'екце Магілёўскай вобласці.
- **Мемарыяльную дошку вядомаму ўрачу-анколагу Канстанціну Шаляпеню адкрылі ў Брэсце.**
- Двое дзяцей загінулі ў лабавым сутыкненні аўтамабіляў у Рэчыцкім раёне.
- **У Мінскай вобласці за тры месяцы ўзбуджана 495 крымінальных спраў у сферы кіберзлачыннасці.**

ISSN 1990 - 763X
22098
9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «НІДЗЕ ТАК, ЯК У БЕЛАРУСІ, НЕ ЗАХАВАЛІСЯ ПІЯНЕРСКІЯ ТРАДЫЦЫІ»

## Лідарамі нараджаюцца

У размове з піянерамі Аляксандр Лукашэнка расказаў: быць лідарам — гэта мець аўтарытэт сярод пагодкаў, каб яны за табой пайшлі. «Чалавек павінен нарадзіцца са здольнасцямі лідара. Вы памятаеце маю крылатую фразу: «Прэзідэнтамі не становяцца, а прэзідэнтамі нараджаюцца». Прэзідэнцкія якасці павінны закладвацца пры нараджэнні. Калі іх у цябе няма, ты будзеш Прэзідэнтам адукаваным, пісьменным, але не будзеш лідарам», — падзяліўся ён. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, каб быць лідарам, неабходна развіваць гэтыя якасці і працаваць так, каб з'яўляцца прыкладам для іншых.

Дзеці запыталіся, якой была піянерская арганізацыя ў дзяцінстве Прэзідэнта. Ён асабліва адзначыў арганізаванасць і жаданне дапамагаць старэйшым у добраўпарадкаванні мясцовасцяў, высадцы дрэў. Прэзідэнт параіў і сучасным піянерам паўдзельнічаць у высадцы дрэў, стварыць піянерскую алею дзесьці побач з Палацам Незалежнасці ці на яго тэрыторыі.

«Я гатоў у гэтым удзельнічаць. Няхай гэта будзе дзве паласы, калі ў Палацы Незалежнасці, — піянерская і камсамольская. Я знайду месца, дзе вам высадзіць гэту алею. Я прапанаваў, вы думайце», — параіў Аляксандр Лукашэнка.

## «Давайце паспрабуем!»

Закранулі ў размове тэму Вялікай Айчыннай вайны, а менавіта подзвігаў маладых камсамольцаў. «Мы ведаем Зою Касмадзям'янскую, Мікалая Гастэлу і іншых герояў. Гэта на слыху, раскручаныя героі, а ёсць вялікая колькасць, тысячы людзей таго часу, якія здзейснілі не меншыя подзвігі, чым яны. Калі вы гэтых людзей «падыміце» — гэта вельмі важна», — дадаў Прэзідэнт.

Піянерскі актыў прапагнуў тэматыку гістарычнай памяці і запрасіў Аляксандра Лукашэнку паўдзельнічаць ва Уроку памяці для школьнікаў і студэнтаў у якасці настаўніка. Ён згадзіўся і папрасіў міністра адукацыі падрыхтаваць адмысловы, нефармальны план занятку, які будзе цікавы маладым людзям. Правесці яго мяркуецца 1 верасня ў Палацы Незалежнасці ці ў музеі Вялікай Айчыннай вайны.

Піянеры папрасілі Прэзідэнта пасадзейнічаць у стварэнні маладзёжнай тэлевізійнай перадачы «Памяць сэрца», куды будуць запрашаць нашчадкаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

«Давайце паспрабуем, пачнём з Другога канала», — згадзіўся Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, гэта вельмі добрая ідэя, калі дзеці «выцягваюць на экран дарослых», людзей, якія зачапілі сваім дзяцінствам вайну. «Чамусьці заўсёды толькі пра вайну кажам. Але і пасля вайны было нялёгка. Мінск у руінах ляжаў, людзі гарбаціліся, аднаўлялі яго як маглі. І іх неабходна паказваць. Яны вельмі цікавыя людзі і цікава расказваюць. У жыцці заўсёды шмат тых, хто здзяйсняў подзвіг не толькі ў баі, але і на працоўным фронце. Паспрабуйце зрабіць гэту перадачу. Мяне папярэдзьце, я хачу паглядзець», — падтрымаў ініцыятыву кіраўнік краіны.

## «Толькі наперад!»

Дзеці папрасілі Прэзідэнта дапамагчы стварыць ім сваю камп'ютарную праграму, прысвечаную піянерыі Беларусі.

«Стварыць мы дапаможам, а наконт суправаджэння вы падумаеце самі. Можа, кожны па 10 капеек скінецца, можа, вам хопіць. Калі не хопіць — скажаце. Я — за, каб у вас была такая пляцоўка», — пагадзіўся Аляксандр Лукашэнка.

Цікаваліся юныя беларусы з лідарскімі задаткамі і міжнароднай палітыкай сваёй краіны. Так, запыталі пра вытокі адносін з Кітаем.

«Будучы дэпутатам парламента, я пабываў у Кітаі (гэта было больш чым 30 гадоў таму) і пазнаёміўся з краінай, як яны пачыналі развіццё. Вярнуўся ў Мінск і сказаў парламенту, што будучыня за гэтай краінай, давайце будзем вучыцца, як берагчы мінулае і глядзець у будучыню. Мяне крытыкавалі, асабліва мінчане, — успомніў Аляксандр Лукашэнка. — Думалі ўсе, што прыклад на Захадзе. А я прапанаваў вучыцца ў кітайцаў, бо за імі будучыня. Глядзіце, прайшло 30 гадоў, я не памыліўся».

Па словах Прэзідэнта, Кітай становіцца сусветным лідарам, таму і сутыкнуўся з ЗША, якія не хочуць, каб у свеце быў яшчэ адзін моцны цэнтр.

«Амерыканцы за кошт гэтага лідарства жывуць. Дзякуючы таму, што яны маюць валюту, долар, яны моцныя і моцная іх эканоміка. Тут з'явіўся Кітай са сваім юанем, са сваёй валютай, са сваім жаданнем быць лідарам. Вы не ведаеце, наколькі кітайцы любяць сваю краіну, наколькі яны адданыя, гатовыя памерці за сваю краіну», — расказаў кіраўнік краіны пра кітайскі народ.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галоўнае ў адносінах з кітайцамі — заваяваць іх давер.

«Калі няма духоўнага, веры, будуць проста ветлівыя адносіны. Калі яны павераць — будуць моцнымі сябрамі. Яны не любяць шумець, заяўляць, выказвацца. Яны ўсё робяць спакойна. Старажытная, моцная цывілізацыя. Ніхто не сумняваецца, што за Кітаем — будучыня», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Адзін з піянераў запытаў у Прэзідэнта пра яго дэвіз па жыцці. Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Толькі наперад! Запомніце, дзеці, вы гэта ўжо разумееце: ні ў якім разе нельга спыняцца. Жыццё вельмі хуткае, бурлівае, кіпучае. Я і дарослым кажу: спынішся — там за вамі такі натоўп, затопчуць ці вы адстанеце. Толькі наперад! Кожны дзень патроху, паціху, але толькі наперад. Ніколі не спыняйцеся», — матываваў падлеткаў Аляксандр Лукашэнка.

## «Наша галава, мазгі — галоўныя прылады працы»

Дзеці цікавіліся і будучымі кар'ернымі перспектывамі для сябе. Напрыклад, запыталі, якія прафесіі будуць запатрабаваныя ў краіне. «Спецыялісты нам неабходныя ўсе, але, ведаеце, у нас няма карысных выкапняў, за кошт якіх можна жыць: нафта, газ, золата, металы. Мы гэта ўсё купляем. А жыць за што? За кошт мазгоў. Таму наша галава, мазгі — галоўныя прылады працы ў Беларусі. Таму ўсе прафесіі добрыя, але важныя прафесіі, якія даюць развіццё нацыі», — сказаў Прэзідэнт.

Успомніў ён пра дасягненні ў IT-сферы, касмічныя праекты, біялагічны кірунак. «Самыя перадавыя кірункі, дзе без навукі не абысціся, — гэтыя прафесіі больш запатрабаваныя, бо гэта дапаможа нам быць у авангардзе, а не плесціся ў хвасце».

У памяць аб сустрэчы кіраўніку краіны піянеры ўручылі падарунак — талісман арганізацыі, рысяня «Агеньчык», зробленага ў тэхніцы сухога валяння з шэрсці.

«Памятайце, усё, што неабходна зрабіць зараз, — у вашых руках, зрабіце. Вы найлепшыя з моладзі. Вы — будучыня нашай краіны. Таму рабіце кожны дзень нешта новае, імкніцеся рухацца наперад. Не спыняйцеся — наперад. Калі ёсць магчымасць дапамагчы тым, хто адстае, дапамажыце. Гэта ў жыцці вам залічыцца. Рабіце дабро, і яно да вас вернецца», — даў наказ на развітанне Прэзідэнт юным беларусам.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### Каментарый у тэму

**Алеся ЛІТВІНОВІЧ, член БРСМ, былы лідар піянерскай дружыны, удзельніца сустрэчы з Прэзідэнтам:** «Атрымала мноства ўражанняў ад размовы. Да гэтага часу не верыцца, што гэта было ў рэальнасці: я змагла наведаць Палац Незалежнасці, мне пашчасціла ўбачыць ужывую Прэзідэнта. Не чакала настолькі шчырага дыялогу, што ўсё будзе проста, без пафасу, душэўна».

**Арыяна ЛАНІНА, дэпутат Маладзёжнага парламента, Гродзенская вобласць:** «У пачатку я вельмі хвалявалася, але атмасфера была добрая, сяброўская, вясёлая. Прэзідэнт расказваў пра сваё дзяцінства, юнацтва. Мы таксама дзяліліся сваімі марамі. Гэта была вельмі пазнавальная сустрэча. Я кожнаму жадаю адчуць такія эмоцыі, сустрэцца з кіраўніком дзяржавы. Я вельмі ганаруся сабой. Нам Прэзідэнт сказаў, што неабходна быць упэўненымі ў сабе і рухацца толькі наперад».

**Андрэй ПРАТАСАЎ, старшыня абласной дзіцячай палаты піянерскай арганізацыі, горад Магілёў:** «Сёння ў Палацы Незалежнасці я, як многія, упершыню. Можна толькі захапляцца тым, што ўсё тут зроблена айчыннымі майстрамі з беларускіх матэрыялаў. Гэта яшчэ адна нагода ганарыцца сваёй краінай, нашымі людзьмі. Эмоцыі немагчыма перадаць. Асабліва запамінальная размова з Прэзідэнтам. Ад кіраўніка краіны ідзе дзівосная энергія. Я пачуў шмат парад ад яго. Напрыклад, не спыняцца ні на крок, калі мы гэта зробім, нашу дарогу займуць іншыя. Галоўны пасыл сённяшняй сустрэчы — рухацца толькі наперад».

# «Тое, што робіць завод грамадзянскай авіяцыі, заслугоўвае самай высокай пахвалы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спікеру верхняй палаты парламента прадэманстравалі сучасныя цэхі прадпрыемства, якое ў 2018 годзе было перанесена з цэнтра сталіцы за яе межы. Наталля Качанава, у сваю чаргу, пацікавілася, ці дастаткова завод мае заказаў.

— Адметна, што гэта прадпрыемства з даўняй гісторыяй, і разам з тым у 2018 годзе яно літаральна пабудавана нанова і сёння працуе дастаткова паспяхова. Гэта экспартаарыентаванае прадпрыемства, якое мае заказчыкаў з шэрагу краін свету. Вельмі важна, што сёння ў няпростых умовах тут дастатковыя аб'ёмы работ, прапрацаваныя кантракты на 2023, 2024 гады, — сказала Наталля Качанава.

Звярнула ўвагу спікер і на работу сумежных галін і прадпрыемстваў па імпартазамяшчэнні, якая мусіць весціся больш актыўна.

— Ёсць пытанні, якія варта адрасаваць сумежным прадпрыемствам, яны павінны больш шчыльна працаваць у адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта па імпартазамяшчэнні. Магчыма, варта было б распрацоўваць фарбы, якія можна выкарыстоўваць пры рамонце і абслугоўванні самалётаў. Увогуле, варта паглядзець, што можна зрабіць, каб у нас быў больш поўны цыкл рамонту і абслугоўвання самалётаў. Але сёння тое, што робіць завод грамадзянскай авіяцыі, заслугоўвае самай высокай пахвалы. Пра гэта кажуць і самі заказчыкі, якія дзякуюць за якасную работу.

Адзначыла Наталля Качанава і неабходнасць завяршэння будаўніцтва фарбавальнага цэха. Увядзенне ў эксплуатацыю гэтага аб'екта дазволіць істотна павялічыць аб'ёмы работ.

— Абавязкова гэтыя пытанні мы абмяркуем ва ўрадзе, звернем асаблівую ўвагу ўсіх зацікаўленых. Варта завяршыць гэту работу.

Як адзначыў **выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара Мінскага завода грамадзянскай авіяцыі № 407 Уладзімір ПЕКАРСКІ,** прадпрыемства працуе на перспектыву. У хуткім часе тут будзе асвоены рамонт новага віду паветраных суднаў. Гэта расійскі сярэднемагістральны вузкафюзеляжны пасажырскі самалёт МС-21.

— У цяперашні час актыўна працуем з распрацоўшчыкам гэтых самалётаў, праводзім навучанне. З мая накіравалі на перападрыхтоўку дзве групы з 24 спецыялістаў. У канцы верасня — пачатку кастрычніка выходзім на сертыфікацыю. У кастрычніку ў нас з'явіцца першы самалёт Sukhoi Superjet. Гэта сучасны новы самалёт, іх выпушчана больш за 200, яны эксплуатуюцца ў «Аэрафлоце», авіякампаніі «Расія». Гэта добрая перспектыва для нашага калектыву.

**Алена КРАВЕЦ.**

Партнёрства

# Не толькі бізнес

**Новую старонку ў гісторыі пабрацімства Гомельшчыны і Браншчыны адкрыў першы рэгіянальны бізнес-форум «Гомель — Бранск». Маштабнае мерапрыемства адразу ж па праве было названа адной са знакавых падзей у развіцці інтэграцыі Саюзнай дзяржавы.**



Бізнес-форум «Гомель — Бранск» заклікаць не толькі паглыбіць вытворчыя кааперацыйныя сувязі, узмацніць эканоміку тэрыторый, пашырыць тавараабарот, але і паспрыяць развіццю супрацоўніцтва ў гуманітарных сферах, дапамагчы жыхарам прыгранічных абласцей Беларусі і Расіі бліжэй пазнаёміцца з патэнцыялам рэгіёнаў.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** на адкрыцці першага рэгіянальнага бізнес-форуму «Гомель — Бранск» выказаў упэўненасць, што мерапрыемства абавязкова стане традыцыйным, багатым на ўзаемавыгадныя інвестыцыйныя праекты і доўгатэрміновыя кантракты, творчыя ідэі.

— Мы разам зробім яго адной з самых чаканых падзей года для жыхароў нашых абласцей. І па-іншаму проста не можа быць, бо правядзенне гэтага форуму — патрэба ў зносінах, у далейшай інтэграцыі, узаемавыгадным супрацоўніцтве, — упэўнены Іван Крупко.

Паводле яго слоў, Бранскі рэгіён — даўні надзейны сябар і стабільны эканамічны партнёр Гомельшчыны, а патэнцыял для развіцця двухбаковага партнёрства цяжка пераацаніць.

— Сапраўднае сяброўства паміж двума нашымі рэгіёнамі, якое дакументальна замацавана амаль чвэрць стагоддзя таму, сёння напаўняецца новымі кропкавымі кантактамі, — дадаў старшыня Гомельскага аблвыканкама і нагадаў, што толькі за апошні час падпісаны пагадненні паміж упраўленнем спорту і турызму Гомельшчыны і дэпартаментам фізічнай культуры Бранскай вобласці, паміж сярэднімі адукацыйнымі і дзіцячымі футбольнымі школамі двух рэгіёнаў.

— Для дэталёвага абмеркавання якраз і падыходзіць такая пляцоўка, як гэты форум. Выпрацоўваем стратэгію, вызначаем праекты, магчымых выканаўцаў і на працягу года рэалізуем намечанае. Форум жа стане генератарам ідэй, стартам да рэалізацыі адобраных праектаў і трыбунай для справаздачы, зробленай за год у інтарэсах развіцця і працвітання дзвюх абласцей, — прапанаваў Іван Крупко.

**Губернатар Бранскай вобласці Аляксандр БАГАМАЗ** адзначыў, што ў тавараабароце расійскага рэгіёна з беларускімі партнёрамі — трэць за Гомельскай вобласцю.

— Браншчына ўваходзіць у дзясятку рэгіёнаў Расіі па тавараабароце з Беларуссю, — дадаў Аляксандр Багамаз.

Губернатар выказаў упэўненасць: ціск, які цяпер аказваецца на Расію і Беларусь, адкрывае і новыя гарызонты.

— Любы крызіс для слабага — гэта праблема, для моцнага — атрыманне новых рынкаў збыту, новых магчымасцяў для выпуску прадукцыі, — падзяліўся кіраўнік расійскага рэгіёна.

Першы рэгіянальны бізнес-форум «Гомель — Бранск» аб'яднаў больш як 100 удзельнікаў — прадстаўнікоў улады, прадпрыемстваў і гандлёва-прамысловых палат. Іх увазе будзе прадстаўлена больш за 300 інвестыцыйных пляцовак для арганізацыі бізнесу — як аб'екты нерухомасці, так і асобныя зямельныя ўчасткі з падрыхтаванай інфраструктурай. Праявілі ініцыятыву ўзяць удзел у рэгіянальным бізнес-форуме на Гомельшчыне больш чым 20 кампаній Бранскай вобласці. Сваю прадукцыю для іх прадставяць каля двух дзясяткаў прадпрыемстваў паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі. Арганізаваны выставы-прэзентацыі прадстаўнікоў будаўнічай галіны, лёгкай і харчовай прамысловасці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

# Трымаць руку на пульсе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так было, напрыклад, са спецыяльнасцю «Праектаванне і эксплуатацыя атамных электрычных станцый». Мы забяспечваем спецыялістамі не толькі БелАЭС, але і атамнагляд, і сферу экалогіі. Нашы выпускнікі працуюць ужо і на пульце атамнай станцыі, а іх заробкі ў гэтай сферы смела могуць канкурыраваць са сферай IT. Цяпер працуем у галіне беспілотнага транспарту.

Дарэчы, сёлета БНТУ аб'явіў набор на спецыяльнасць «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» па кірунку «Лічбавыя тэхналогіі на прамысловым прадпрыемстве» — гэта так званая індустрыя 4.0. Студэнты будуць атрымліваць эканамічныя, праектныя, вытворча-тэхналагічныя, інфармацыйна-аналітычныя і іншыя навыкі, неабходныя для стварэння разумнай прамысловай вытворчасці, развіцця спадарожных лічбавых паслуг і пераходу прамысловага прадпрыемства да лічбавых бізнес-мадэляў.

Зразумела, што спецыяліста за адзін дзень падрыхтаваць немагчыма, таму ўсё плануецца стратэгічна. Напрыклад, сёння шмат увагі ўдзяляецца клопату аб навакольным асяроддзі і рэсурсазберажэнні. «Зялёныя стандарты» актыўна ўкараняюцца ў будаўніцтве і іншых галінах, вызначаны цэлы комплекс альтэрнатыўных крыніц. У планах БНТУ на найбліжэйшыя гады — распачаць падрыхтоўку сіці-менеджараў і ўрбанолагаў. Веды такіх спецыялістаў спатрэбяцца ў розных сферах: горадабудаўніцтве, архітэктуры, лагістыцы, экалогіі...

## АРЫЕНЦІРЫ ДЛЯ МОЛАДЗІ

Не сакрэт, што моладзь часта выбірае спецыяльнасць, арыентуючыся на моду і кідкую назву, а не на перспектывы будучага працаўладкавання. У БНТУ дзейнічае 16 факультэтаў па розных напрамках: энергетыка, машынабудаванне, аўтамабіле- і трактарабудаванне, будаўніцтва, архітэктура. Плюс ваенна-тэхнічны факультэт. Рыхтуюцца кадры па 85 спецыяльнасцях. Як жа абітурыенту ў іх разабрацца? Для БНТУ праблема апошняга дня падачы дакументаў стаіць асабліва востра: маладыя людзі часта выбіраюць спецыяльнасці, зыходзячы з балаў у сваіх сертыфікатах, і да апошняга спрабуюць пралічыць шанцы на паступленне.



У прыёмнай камісіі БНТУ раяць **арыентавацца ўсё ж такі не на кідкую назву, а вывучаць кампетэнцыі, якія атрымліваюць тыя, хто там навучаецца.** Напрыклад, вядучыя будаўнічыя прадпрыемствы краіны маюць вострую патрэбу ў інжынерах, якія дасканала ведаюць інавацыйнае абсталяванне, што прымяняецца ва ўсім шматпрофільным будаўнічым комплексе. Менавіта таму ў БНТУ летась адкрылася спецыяльнасць **«Інавацыйная тэхніка для будаўнічага комплексу».** Падрыхтоўка ў рамках спецыяльнасці праводзіцца па трох спецыялізацыях: «Інавацыйная тэхніка для будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог», «Ліфты, эскалатары, травалатары і пад'ёмна-транспартныя машыны» і «Інавацыйнае абсталяванне для атрымання прадуктаў з адпрацаваных будаўнічых канструкцый». Будучыя інжынеры атрымаюць навыкі аўтаматызаванага праектавання дэталяў, агрэгатаў і машын, а таксама будуць ведаць усё аб інавацыйным абсталяванні будаўнічага комплексу. Выпускнікі спецыяльнасці змогуць працаваць на машынабудаўнічых прадпрыемствах, якія выпускаюць пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя і дарожныя машыны, у буйных гандлёвых цэнтрах, метро, на вакзалах, у Нацыянальным аэрапорце ў якасці інжынераў па эксплуатацыі грузапад'ёмных механізмаў, ліфтаў, эскалатараў і на іншых аб'ектах.

Яшчэ адна новая цікавая спецыяльнасць, якая адкрылася летась, — **«Прамысловы дызайн»** з двума кірункамі: дызайн транспартных сродкаў і дызайн прамысловага абсталявання. Студэнтаў чакае паглыбленая падрыхтоўка ў галіне дызайн-праектавання транспартных сродкаў і вытворчага абсталявання. У працэсе падрыхтоўкі інжынерных кадраў увага будзе ўдзяляцца метадам і сродкам мастацкага канструявання, кампазіцыі, каларыстыкі, макетавання і трохмернага мадэлявання знешняй будовы, а таксама інтэр'еру кабін, працоўнага месца аператара і пасажырскага салона транспартных сродкаў. Падрыхтоўка інжынераў-дызайнераў будзе ажыццяўляцца для розных тэхнічных напрамкаў, звязаных з даследаваннем, праектаваннем і вытворчасцю аўтатрактарнай, будаўніча-дарожнай тэхнікі, сродкаў гарадскога транспарту, у тым ліку электрычнага і аўтаномнага, а таксама для навукова-даследчых, праектных арганізацый і дызайнерскіх бюро. Выпускнікі спецыяльнасці змогуць працаўладкавацца на вядучыя прадпрыемствы ў галіне машынабудавання, сярод якіх ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў», Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ААТ «Мінскі трактарны завод» і іншыя.

Выпускнікі кірунку «Прамысловы дызайн вытворчага абсталявання» будуць запатрабаваныя на прадпрыемствах станкабудавання, прыборабудавання, бытавой тэхнікі, электратэхнічнай і радыёэлектроннай прамысловасці, вылічальнай тэхнікі, транспартнага машынабудавання і лёгкай прамысловасці. Іх чакаюць заняткі па асновах вэб-дызайну, распрацоўцы кампазіцый у прамысловым дызайне, засваенне спецыялізаваных праграмных прадуктаў для мадэлявання і візуалізацыі.

## УНІВЕРСІТЭТ 3.0

— Наш спецыяліст выйдзе на рынак працы праз чатыры-пяць гадоў. І ніхто ні ведае, што будзе ў эканоміцы ў гэты час, — разважае Георгій Вяршына. — Нам могуць сказаць, што мы рыхтуем спецыялістаў учарашняга дня. Таму пры падрыхтоўцы, незалежна ад спецыяльнасці, павінна забяспечвацца некалькі важных умоў. Веданне лічбавых тэхналогій — аснова. Таксама выпускнік павінен разумець, як ствараюцца новыя матэрыялы. Трэцяе — валоданне элементамі дызайну (прамысловага, архітэктурнага, вэб-дызайну) і англійскай мовай. Гэта дае магчымасць працаваць у любым пункце свету і быць універсальным спецыялістам.

Да таго ж у сучасным свеце адных толькі ведаў тэхнічнага характару недастаткова. Трэба ўмець яшчэ прасунуць свой прадукт (распрацоўку), прадаць яго і атрымаць прыбытак. Канцэпцыя «Універсітэта 3.0», якая рэалізоўваецца ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, — спалучэнне адукацыі, навукі і інавацыйнага прадпрымальніцтва, што непарыўна звязаны паміж сабой. Такія навыкі ў БНТУ развіваюць з дапамогай тэхнапарка «Палітэхнік». Гэта тая структура, якая акумулюе інавацыйны патэнцыял і дазваляе, падтрымліваючы стартапы, даваць і развіваць вострадэфіцытныя навыкі.

Першы прарэктар БНТУ лічыць мэтавае навучанне найлепшай формай падрыхтоўкі спецыяліста: «Сваю кар'еру значна прасцей пабудаваць на адным прадпрыемстве. Абітурыенту, які свядома заключае дагавор на мэтавую падрыхтоўку, гарантавана і працаўладкаванне пасля заканчэння навучання, і падтрымка. Цяпер некаторыя прадпрыемствы вельмі ў гэтым зацікаўлены, напрыклад, Мінскі аўтамабільны завод. Работадаўцы не проста зацікаўлены ў кадрах, а гатовы аказваць дапамогу ў падрыхтоўцы спецыяліста. А калі малады чалавек прыйдзе на прадпрыемства, скажам, у аддзел галоўнага канструктара або тэхнолага, ён ужо будзе спецыялістам з перспектывай».

Усяго БНТУ сёлета плануе прыняць на першы курс 4365 абітурыентаў плюс 101 чалавек на ваенна-тэхнічны факультэт. «Лічбы набору на бюджэт засталіся практычна на ранейшым узроўні: мы набіраем толькі на 11 чалавек менш, чым летась, — заўважыў Георгій Вяршына. — А на пазабюджэтнай форме набор зменшыўся на 70 чалавек. На мэтавую падрыхтоўку плануем прыняць 42 абітурыенты. Інфармацыя пра тое, што заключаць дагаворы на мэтавую падрыхтоўку цяпер могуць усе прадпрыемствы, незалежна ад месца іх знаходжання, у тым ліку і ў буйных гарадах, з'явілася крыху са спазненнем. Таму, мяркую, наймальнікі не паспелі сарыентавацца. Спадзяёмся, што ў наступным годзе лічбы мэтавага набору будуць ужо іншыя».

Таксама Георгій Вяршына паведаміў, што ў Беларусі зараз распрацоўваюцца навучальныя праграмы для профільных класаў інжынернай накіраванасці. «Спадзяёмся, да 1 верасня кожны факультэт БНТУ будзе мець свой профільны клас у адной з гімназій Мінска, Баранавіч і іншых гарадоў Беларусі. А далей усё будзе залежаць ад цікавасці з боку навучэнцаў школ. Калі нашы профільныя класы будуць карыстацца папулярнасцю і іх колькасць будзе расці, тады мы выйдзем з прапановай у Міністэрства адукацыі аб увядзенні ў правілы прыёму пэўных ільгот для гэтай катэгорыі абітурыентаў. Такія льготы ёсць, напрыклад, у выпускнікоў педагагічных, сельскагаспадарчых, спартыўна-педагагічных і ваенна-патрыятычных класаў. Мяркуем, што аналагічны парадак прыёму можа распаўсюдзіцца і на будучых інжынераў, калі яны будуць здзяйсняць свой выбар усвядомлена».

**Надзея НІКАЛАЕВА,**
**фота аўтара.**

Будзь у курсе!

# ГРАФІК ПРЫЁМНЫХ КАМІСІЙ

Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджаны тэрміны правядзення ў 2022 годзе ўступнай кампаніі ў вышэйшых навучальных установах

**Прыём дакументаў распачнецца сёлета 18 ліпеня. З 18 да 24 ліпеня вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.**

Для некаторых катэгорый абітурыентаў тэрміны падачы дакументаў іншыя. Так, з 18 да 26 ліпеня будуць прымаць дакументы ад тых, хто паступае на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю на дзённае аддзяленне (бюджэтную форму), у Ваенную акадэмію, Інстытут пагранічнай службы, а таксама на ваенныя факультэты (на бюджэт).

А з 15 лістапада да 5 снежня — ад тых, хто паступае на завочную форму атрымання адукацыі ва ўстановы дадзенага профілю.

Усяго чатыры дні (з 18 да 22 ліпеня) адведзена на прыём дакументаў ад выпускнікоў профільных педагагічных, спартыўна-педагагічных і аграрных класаў, якія паступаюць без здачы экзаменаў па сумоўі на педагагічныя спецыяльнасці, напрамак «Фізічная культура і спорт» і спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымацца:

- **з 18 ліпеня да 3 жніўня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;
- **з 18 ліпеня да 9 жніўня** — на дзённую форму атрымання адукацыі па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях (з 15 лістапада да 5 снежня — на завочную форму па дадзеным профілі);
- **з 18 ліпеня да 8 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Унутраныя ўступныя іспыты ў ВНУ па асобных спецыяльнасцях (спартыўныя, творчыя, інтэграваныя) пройдуць з 25 ліпеня да 2 жніўня.

У Акадэміі МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, Ваеннай акадэміі, на ваенных факультэтах ВНУ ўнутраныя выпрабаванні пройдуць з 25 да 27 ліпеня. На ваенным факультэце Гродзенскага ўніверсітэта — 27—28 ліпеня. З 29 ліпеня да 4 жніўня будуць здаваць экзамены абітурыенты, якія паступаюць на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці на дзённую форму і з 6 да 15 снежня — на завочную.

Тэрміны залічэння абітурыентаў на месцы, устаноўленыя кантрольнымі лічбамі прыёму для атрымання вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту:

* да 29 ліпеня — у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, Інстытуце пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, на ваенных факультэтах ВНУ;

* да 4 жніўня — у іншых дзяржаўных ВНУ;

* да 20 снежня — на завочную форму атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю.

На платную форму навучання тэрміны залічэння абітурыентаў ва ўсіх ВНУ — да 10 жніўня, толькі на завочную форму атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю — да 20 снежня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Год гістарычнай памяці

# МЕСЦА СЛАВЫ І ГОНАРУ

## Як міліцыянеры Магілёўшчыны захоўваюць памяць аб сваіх папярэдніках



Слухачом першай экскурсіі ў абноўленай гісторыка-дэманстрацыйнай зале стаў і міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ.

**Напярэдадні Дня Перамогі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама адкрылася абноўленая гісторыка-дэманстрацыйная зала. Яе першымі наведвальнікамі сталі міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван Кубракоў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны палкоўнік міліцыі Мікалай Ількевіч, кіраўнікі ўпраўленняў унутраных спраў.**

Азнаёміцца з гісторыяй міліцыі Магілёўскай вобласці, лёсамі ўнікальных праваахоўнікаў і цікавымі экспанатамі змогуць не толькі супрацоўнікі ўнутраных спраў. Экскурсіі будуць праводзіцца для школьнікаў, студэнтаў, будучых прадстаўнікоў сілавога блока краіны. Экспазіцыя зацікавіць нават непадрыхтаванага гледача. У гэтым карэспандэнт «Звязды» пераканалася асабіста.

Праўда, мне яшчэ і з «экскурсаводам» пашанцавала. Больш за старшыню ветэранскай арганізацыі УУС Магілёўскага аблвыканкама Яўгена Кавалёнка пра гісторыю абласной міліцыі не ведае ніхто. Да ведамства ён мае самае прамое дачыненне — у свой час Яўген Яўгенавіч з'яўляўся начальнікам крымінальнага вышуку, намеснікам начальніка крымінальнай міліцыі УУС Магілёўскага аблвыканкама. На яго асабістым уліку — сотні раскрытых крымінальных спраў.

### З чаго ўсё пачалося

Знаёмства з экспазіцыяй гісторыка-дэманстрацыйнай залы пачынаецца з гісторыі станаўлення беларускай міліцыі. Асобная ўвага — гістарычнаму перыяду, калі свае першыя прафесійныя крокі рабілі міліцыянеры Магілёўшчыны. Акунуцца ў тыя падзеі дапамагаюць дакументы, фотаздымкі, тагачасныя газеты, а таксама дакументальны фільм, які можна паглядзець тут жа, не адыходзячы ад экспазіцыйнай вітрыны. Асноўныя дакументы, якія сведчаць аб стварэнні ў рэгіёне міліцыі, алічбаваныя — усе яны прадстаўлены для наведвальнікаў у электронным варыянце.

Дзякуючы ім, у прыватнасці, можна даведацца, што днём нараджэння магілёўскай міліцыі лічыцца 19 мая 1918 года. Шэрагі праваахоўнікаў, як адлюстроўваюць фотаздымкі, папаўняліся вайскоўцамі Чырвонай Арміі, якія дэмабілізоўваліся. Сярод найбольш цікавых экспанатаў — пашпарт для гандляроў, павестка, выканаўчы ліст і іншыя дакументы таго часу. Гісторыю міліцыі, у тым ліку магілёўскай, можна вывучаць па публікацыях ведамаснай газеты «На варце Кастрычніка» (цяпер «На страже»).

Расказваецца і пра першых кіраўнікоў павятовых (цяпер раённых) аддзелаў міліцыі. У экспазіцыі — партрэты начальніка Краснапольскай міліцыі Аляксандра Савекіна, а таксама міліцыянера Івана Карасёва. Восенню 1920 года яны загінулі ад рук бандытаў.

— Карыстаючыся тым, што ў Чэрыкаўскі павет для выканання пастаўленай задачы па барацьбе з бандытызмам адбылі супрацоўнікі міліцыі, зламыснікі напалі на Краснаполле, — расказвае Яўген Кавалёнак. — Падпалілі некалькі хат, захапілі будынак міліцыі. Як успаміналі сведкі тых падзей, Савекін і Карасёў адстрэльваліся да апошняга патрона. Пакуль іх не забілі, адважныя міліцыянеры паспелі знішчыць частку сакрэтных дакументаў. Бандыты да таго былі ўзлаваныя, што целы міліцыянераў прылюдна, на вачах родных, спалілі на вогнішчы. У гонар стагоддзя краснапольскай міліцыі супрацоўнікі і ветэраны органаў унутраных спраў устанавілі на магіле Аляксандра Савекіна новы помнік. Увекавечвае памяць загінулых калег і мемарыяльная дошка, устаноўленая на сучасным будынку аддзела ўнутраных спраў Краснапольскага райвыканкама.

### Героі вайны

Асобны раздзел гісторыка-дэманстрацыйнай залы прысвечаны подзвігу супрацоўнікаў магілёўскай міліцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Першыя бомбы на абласны цэнтр упалі 25 чэрвеня. Тут ужо знаходзіўся ўрад Беларусі. Горад абаранялі з усіх напрамкаў.

У гісторыю ўвайшоў подзвіг батальёна міліцыі Канстанціна Уладзімірава. Непадалёк ад Магілёва, у раёне вёскі Гаі, з 12 да 18 ліпеня 1941 года батальён міліцыі капітана Уладзімірава вёў няроўны бой з акупантамі. Шэсць сутак без ежы, сну і адпачынку — міліцыянеры стаялі на смерць. З 250 байцоў падраздзялення ў жывых засталося ўсяго 19 чалавек — кантужаных і параненых. Вораг далей не прайшоў. На месцы, дзе міліцыянеры адважна змагаліся з немцамі, пастаўлены помнік.

У экспазіцыі подзвігу байцоў капітана Уладзімірава — асаблівая ўвага. На своеасаблівай дошцы гонару — партрэты тых міліцыянераў, якія, паводле сведчанняў відавочцаў і аповедаў іншых людзей, удзельнічалі ў тым страшным баі. Сямён Дрышчанка — адзіны з 250 байцоў падраздзялення, асоба якога была пацверджана дакументальна. У 2020 годзе падчас пошукава-палявых работ, якія рэгулярна праводзяцца на гэтым месцы вайскоўцамі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, членамі Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру», супрацоўнікамі і курсантамі Магілёўскага інстытута МУС, побач з астанкамі ўдалося выявіць дакументы на імя міліцыянера Сямёна Дрышчанкі, а таксама яго пяро і ручку, якімі ён некалі карыстаўся.

Сучасныя тэхналогіі пераносяць у далёкі 1941 год і дазваляюць стаць непасрэдным сведкам тых атак, якія цаной свайго жыцця адбівалі байцы батальёна Уладзімірава. Спецэфекты перадаюць напружанасць тых баёў, мужнасць і самаахвярнасць міліцыянераў — на некалькі хвілін здаецца, што ты там, у гэтым ачагу болі, адвагі і патрыятызму. Ажно дрыжыкі па скуры! Сапраўды, цяпер можна паверыць у тое, што немцы пасля баяліся ісці на гэтую вышыню.

Унікальнай старонкай у біяграфіі беларускай міліцыі ганарацца супрацоўнікі органаў унутраных спраў усіх рэгіёнаў краіны. У гісторыка-дэманстрацыйнай зале захоўваецца асабістая справа капітана Уладзімірава, яго паляўнічая стрэльба, якую пасля вайны на захоўванне перадаў яго сын. Камандзір батальёна загінуў у апошнім баі. Па сведчанні байцоў, паранены, ён падняўся і першым пайшоў у бой. Месца яго пахавання дагэтуль не ўстаноўлена.

З біяграфіяй некаторых байцоў батальёна можна пазнаёміцца і дзякуючы электроннаму носьбіту, якім мае магчымасць скарыстацца любы наведвальнік. Таксама можна праслухаць успаміны ўдзельнікаў абароны Магілёва, якім пашчасціла выжыць у тым жудасным марафоне атак: Сырамалотава, Калугіна і Кожава.

Расказваецца ў экспазіцыі і пра подзвіг Аляксея Банькоўскага, супрацоўніка крымінальнага вышуку, які загінуў ад рук акупантаў, якія, каб пранікнуць у Магілёў, пераапрануліся ў міліцэйскую форму. Банькоўскі адным з першых заўважыў варожы авіядэсант, уступіў з ім у супраціўленне — загінуў. Так здарылася, што магілу адважнага міліцыянера змыла вадой. Па словах Яўгена Кавалёнка, доўгі час дачка Банькоўскага ў дзень гібелі бацькі прыходзіла з кветкамі да памятнага знака супрацоўнікам, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку, адкрытага на тэрыторыі ўпраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама.

### Цаной свайго жыцця

Як развівалася міліцыя пасля вайны, расказваюць наступныя экспазіцыйныя стэнды. Тут можна ўбачыць і спецыяльную тэхніку, якой у савецкі час карысталіся праваахоўнікі: першыя камп'ютары, алкатэстары, фотастрэльба для фіксацыі хуткасці на далёкіх адлегласцях ды іншыя прыстасаванні.

Акрамя таго, прадстаўлена абмундзіраванне супрацоўнікаў органаў унутраных спраў розных перыядаў. Напрыклад, шынель міліцыянера Цеплякова, які захаваўся ў выдатным стане. А, між іншым, старшына міліцыі апранаў яго падчас язды на матацыкле і летам, і зімой. Форму Васіля Ермачэнкі, які служыў у Касцюковіцкім райаддзеле і загінуў пры выкананні службовага абавязку, перадала яго сям'я. Знаходзячыся ў адпачынку, міліцыянер атрымаў інфармацыю аб тым, што яго знаёмы захапіў у заложнікі свайго сына і пагражаў яго забіць. Перагаворы не мелі выніку. Затым Васіль Ермачэнка трапіў у дом: там міліцыянера напаткала куля. Сын адважнага чалавека працягвае міліцэйскую дынастыю: служыць намеснікам начальніка аддзела ўнутраных спраў Клімавіцкага райвыканкама, з'яўляецца падпалкоўнікам міліцыі.

Загінулым пры выкананні службовага абавязку міліцыянерам Магілёўшчыны ў гісторыка-дэманстрацыйнай зале прысвечана асаблівая ўвага: захоўваюцца іх партрэты, асабістыя рэчы. Цаной уласнага жыцця гэтыя людзі выратавалі іншых.

7 мая 1945 года, за два дні да Перамогі, пры затрыманні ўзброенага злачынца ў вёсцы Прудок Чавускага раёна, загінулі супрацоўнікі раённага аддзела НКУС па Магілёўскай вобласці Іван Барысаў і Іван Рудакоў. Участковы інспектар Мікалай Каробкін загінуў адразу пасля вайны, у 1946 годзе, падчас ліквідацыі банды злачынцаў у Горацкім раёне — нягледзячы на тое, што ваенныя дзеянні скончыліся і была аб'яўлена Перамога, настроеныя супраць савецкай улады фарміраванні працягвалі рабіць свае чорныя справы. Падчас ліквідацыі бандыцкай групоўкі загінуў і начальнік крымінальнага вышуку Сяргей Паноў. Міліцыянер Сяргей Сінцароў у 1995 годзе заступіўся за жанчыну падчас затрымання праваparушальнікаў у рэстаране гасцініцы «Магілёў» і быў паранены. Праз месяц памёр. Міліцыянера Аляксандра Ігнатава забілі падчас дастаўкі ў Чэрыкаўскі райаддзел затрыманых за правапарушэнне.

### Дапамагалі іншым

— А Капыцін?

— Капыцін капае! Ён зрабіў археалагічную карту Верхняга Падняпроўя. У экспедыцыях са студэнтамі абхадзіў-аблазіў уздоўж Дняпра ўсе стаянкі старажытных людзей у каменным веку, вывучыў і апісаў курганныя пахаванні, прайшоўся па маршрутах руху і рассялення плямёнаў і ўсё гэта нанёс на карту. У тым ліку і археалагічныя помнікі ў раёнах, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Паходы, раскопкі, ночы ў палатках з размовамі каля вогнішча. Студэнты Вячаслава Фёдаравіча абагаўляюць! Я лічу, што гэта прыклад дзейснай ідэалагічнай працы! Маладыя людзі праз натуральную прыроду свайго краю, праз нялёгкую працу з рыдлёўкай, перасыпаючы пры гэтым зямлю рукамі і знаходзячы старадаўнія артэфакты, слухаючы аповеды свайго куміра пра старажытных людзей, якія выжывалі ў няпростых умовах і, тым не менш, знаходзілі для сваіх стаянак найпрыгажэйшыя прыродныя мясціны, убіралі ў сябе любоў да роднай зямлі, адчуваюць гонар за айчынную гісторыю, пранікаюцца шчырай павагай да жыццялюбства і мудрасці прашчураў.

— Я таксама з Капыціным ездзіў на археалагічныя раскопкі! Незабыўныя часіны! — гледзячы на Мясніковіча, усклікнуў Прэзідэнт. — А як сябе адчувае Трашчанок? — працягвае распытваць Аляксандр Рыгоравіч.

— Чытае! І лекцыі, і кнігі, якія працягвае «праглынаць» у вялікай колькасці. І калі ён у што-небудзь паверыў, то яго ўжо не павернеш!

— І не паваліш! — усміхнуўся Прэзідэнт. — А яна?

Я разумеў, што ён пытае пра жонку Якава Іванавіча Трашчанка Таццяну Пятроўну. Яна працавала лабаранткай кафедры нямецкай мовы, але з-за свайго таварыскага і жывога характару была вядомая ва ўсім універсітэце.

— Загадвае кафедрай нямецкай мовы. Не, загадчык там ёсць...

Я не паспяваю закончыць, як Аляксандр Рыгоравіч, махнуўшы рукою, працягвае:

— Я і не сумняваюся! Гэта ж рухавік! Яна ўсіх разварушыць, арганізуе, ды яшчэ і запатрабуе з кожнага рэзультатаў у працы! Студэнтамі мы яе ведалі болей, чым іншых выкладчыкаў! А Рыер?

— Які? Рыгор Якаўлевіч, Рыер-бацька, ужо памёр. А Якаў Рыгоравіч, Рыер-сын, абараніў доктарскую дысертацыю, працуе ў нас на гістарычным факультэце прафесарам, разам з Капыціным займаюцца археалогіяй, вакол іх заўсёды навуковая моладзь.

— Сына я не ведаю, а вось лекцыі Рыгора Якаўлевіча я слухаў з задавальненнем. Глыбокі вучоны і выдатны педагог! Мне таксама падабаліся лекцыі па палітэканоміі Іны Анатольеўны Прашляковай. Яна яшчэ працуе?

— Яна доўгі час узначальвала факультэт дашкольнага выхавання, па сутнасці, стварала гэты факультэт. Разумная, аўтарытэтная і прыгожая жанчына.

Тады мне здавалася, што Прэзідэнт акунуўся ў свае студэнцкія гады, у юнацтва. У кожнага чалавека яны выклікаюць прыемныя ўспаміны, асабліва калі ты атрымаў ад вучобы задавальненне, знаходзіўся ў коле разумных выкладчыкаў і цікавых сяброў. У Аляксандра Рыгоравіча ўсё так і было, я таму сведка — мы вучыліся ў адзін час, ведалі сваіх выкладчыкаў, і ў нас былі агульныя сябры. Але толькі з часам я зразумеў, што ў Прэзідэнта няма магчымасці проста аддацца прыемным успамінам. Ён выкарыстоўвае ў працы любы момант, любую сітуацыю, каб прадумаць хвалюючую яго праблему, знайсці адказ на пытанне, якое яго трывожыла. І пра Якава Іванавіча Трашчанка ён тым разам пытаўся недарэмна. Ужо праз два месяцы я прысутнічаў на нарадзе рэктараў з удзелам Прэзідэнта. І ён зусім нечакана падняў мяне для прадаўжэння размовы пра гэтага выкладчыка. Яшчэ раз пацікавіўшыся здароўем Трашчанка, Аляксандр Рыгоравіч перадаў яму заданне распрацаваць канцэпцыю вучэбнага курса гісторыі Беларусі. Для школ і вышэйшых навучальных устаноў. А мне, рэктару, даручыў арганізаваць працу творчай групы Якава Іванавіча. Таму калі я ўжо як міністр інструктаваў прэтэндэнтаў на рэктарскую пасаду перад іх сустрэчай з Прэзідэнтам, то рэкамендаваў ім не толькі самым шчыльным чынам рыхтавацца па ўсіх кірунках работы і развіцця іх універсітэтаў, але і быць гранічна ўважлівымі да пытанняў і даручэнняў Аляксандра Рыгоравіча. А ён, дарэчы, любіў стасункі з рэктарамі, практычна ўсіх ведаў выдатна, ніколі не губляў магчымасці наведаць універсітэт і аднойчы мне сказаў, што пасаду рэктара лічыць адной з самых прывабных.

Прыехаўшы ў Магілёў, вечарам, у дзень майго прызначэння, я звязаўся з губернатарам Барысам Васільевічам Батурам і папрасіў сустрэчу, каб праінфармаваць яго пра даручэнні Прэзідэнта. Мне патрэбна была падтрымка абласнога кіраўніцтва ў развіцці ўніверсітэта, таму такая сустрэча бачылася проста неабходнай. Барыс Васільевіч прыняў мяне на наступны дзень у восем гадзін раніцы. Слухаў уважліва, але мне падалося, што ён ведае не толькі пра змест размовы са мной Прэзідэнта, але нават і пра атмасферу гэтай сустрэчы. Толькі пасля я даведаўся, што Мясніковіч і Батура — даўнія сябры, таму нядзіўнай у дадзеным выпадку была і яго дасведчанасць. З Барысам Васільевічам мы пасябравалі. Ён наколькі мог падтрымліваў наш універсітэт, а мы дапамагалі яму развіваць Магілёўскую вобласць.

Першым прарэктарам я працаваў сем гадоў і за гэтыя гады набыў пэўны вопыт кіраўніка ўніверсітэта. Дзеючы рэктар М. А. Аўласевіч мне давяраў, былы рэктар Я. П. Кудрашоў мне раіў і дапамагаў, больш за тое, Міхаіл Аляксандравіч усе асноўныя пытанні функцыянавання ВНУ, па сутнасці, перадаручаў мне. І я «кіраваў». Таму здавалася, што і ў новым статусе для мяне ўсё будзе па-ранейшаму. Я ж бачу і адчуваю ўніверсітэт дасканальна, ва ўсіх яго праявах, зменіцца толькі кабінет. Як жа я памыляўся!

Ужо перад прызначэннем, пры падрыхтоўцы да сустрэчы з Прэзідэнтам, я ясна ўсведамляў, што рэктар — гэта ўжо палітык. І ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Тваё прызначэнне ўзгодніць Кіраўнік дзяржавы, і тым самым ты непасрэдна ўваходзіш у яго палітычную каманду, кіруешся яго выбарчай праграмай і абавязаны з максімальнай аддачай працаваць над яе рэалізацыяй. Прэзідэнт мае рацыю, асабіста разглядаючы і вывучаючы кандыдатуры на пасаду кіраўніка ўніверсітэта. Любая ВНУ — гэта кіпучы вулкан палітычных ідэй, ідэалагічных дактрын, маладой і гарачай энергіі. Так было ва ўсе часы! Таму рэктары па вызначэнні палітыкі.

А ў пераносным сэнсе рэктар адказвае за палітыку развіцця даверанай яму ўстановы. І гэта не меншы галаўны боль! Трэба ацэньваць навуковы патэнцыял універсітэта, кадравы склад, матэрыяльную базу, попыт на кадры, прадумаць узаемадзеянне з рэспубліканскім і мясцовым кіраўніцтвам, умацаваць міжнародныя сувязі, на гэтай базе сфарміраваць стратэгічныя і тактычныя задачы перспектыўнага жыцця ВНУ і пераканаць у неабходнасці іх вырашэння даручаны табе калектыў. І калі ты не прымаеш гэтыя палітычныя ўстаноўкі, не адчуваеш іх глыбіню і шчыра не можаш ісці следам за імі — лепей адмоўся ад пасады рэктара. У жыцці ёсць многа цікавых заняткаў, якія цалкам захопліваюць чалавека!

І яшчэ! Трэба знайсці ідэю, якая займае прыкметнае месца ў існаванні і развіцці ўніверсітэта, якая, можа быць, ёсць і ў іншых ВНУ, але ў цябе яна найболей яркая, прадукцыйная, болей пераканаўчая. Каб усе рэктары-калегі разумелі і гаварылі: «Так, у нашым універсітэце гэта таксама робіцца. Але ў Магілёўскім гэта сапраўды пастаўлена лепей!» Такія задачы я, як міністр адукацыі, даваў усім кандыдатам на рэктарскую пасаду. А ў якасці дасягненняў універсітэта прыводзіў прыклад сваіх разваг і дзеянняў пасля прызначэння мяне рэктарам Магілёўскага ўніверсітэта.

З самага пачатку мне было зразумела, што ў арганізацыі навуковых даследаванняў і дасягнення ў гэтым кірунку маштабных вынікаў мы ніколі не абыдзем, напрыклад, БДУ, і не толькі БДУ. Вучэбны працэс у кожным універсітэце павінен быць строга і якасна арганізаваны. Гэта святое, тут асабліва вылучыцца таксама не выпадае. Прыкметна ўмацаваць матэрыяльную базу, пабудаваць вучэбны корпус з арыгінальнай архітэктурай... Грошай на гэта дакладна не знайсці. Дамагчыся рэкордных спартыўных рэзультатаў — можна, але спорт часта непрадказальны. Усе гэтыя разважанні прывялі мяне і маіх калег да думкі, што ўніверсітэт — гэта яшчэ і ідэалагічны цэнтр. У навуковым, метадычным, арганізацыйным і вучэбна-выхаваўчым аспектах. І наш Магілёўскі ўніверсітэт можа гэта прадэманстраваць, мусіць, лепей за іншыя ВНУ краіны. Мы зможам гэтым вызначыцца!

Сапраўды, у кожным універсітэце, у тым ліку і ў нашым, на навуковай аснове распрацоўваюцца базавыя канцэпцыі ідэалагічнай работы, якія адразу ж непасрэдна адаптуюцца да жыцця праз студэнцкае асяроддзе.

Прывяду толькі два прыклады. Пасля развалу Савецкага Саюза перастала быць стратэгічнай ідэалогія марксізму-ленінізму. У ВНУ востра стаяла пытанне, якой філасофіі вучыць студэнтаў. Менавіта ў Магілёўскім універсітэце прафесар М. І. Вішнеўскі распрацаваў канцэпцыю філасофскага сінтэзу, якая прадвызначала вывучэнне ўсіх устойлівых на дадзены час філасофскіх тэорый, што дэманструюць працэс пазнання і асэнсавання навакольнага свету выдатнымі мыслярамі. У тым ліку і Карлам Марксам, Фрыдрыхам Энгельсам і Уладзімірам Леніным. І такі падыход да выкладання філасофіі ва ўніверсітэтах атрымаўся запатрабаваны. Больш за тое, у свой час Прэзідэнт даручаў мне як міністру арганізаваць падрыхтоўку школьных падручнікаў па грамадазнаўстве: і краіна ўжо іншая, і грамадства пабудавана інакш, і філасофія патрабуецца сучасная. І я прасіў Міхаіла Іванавіча падрыхтаваць такія падручнікі для 9—11 класаў. Ён разам са сваімі калегамі выпрацаваў канцэпцыю гэтага вучэбнага прадмета, яны склалі вучэбную праграму і напісалі падручнікі. Школьнікі да гэтага часу па іх вучацца, і да мяне не дайшло ніводнай рэкламацыі.

І другі прыклад — распрацоўка ў нашым Магілёўскім універсітэце па даручэнні Прэзідэнта канцэпцыі выкладання ў ВНУ і школах краіны гісторыі Беларусі. Гэтую працу выканаў творчы калектыў пад навуковым кіраўніцтвам дацэнта Я. І. Трашчанка.

**Пераклаў з рускай мовы**
**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*Працяг будзе 28 мая.*

***(Працяг. Пачатак за 26 сакавіка, 2, 9, 16, 23, 30 красавіка, 7, 14 мая.)***

# ШТО МОЖА ТВОРЧЫ САЮЗ?
## Дзеячы тэатра будуць абмяркоўваць на з'ездзе



**Сіла мастацтва — гэта як сіла жыцця: пра яе можна наогул не думаць, але калі яе аднойчы адчуў, то будзеш клапаціцца, каб не страціць. А ёсць асобы, для якіх мастацтва, у прыватнасці тэатральнае, і ёсць жыццё. Хтосьці адчувае, што шчаслівае, хтосьці скажа, што драматычнае, хтосьці пагодзіцца, што непрадказальнае — як само мастацтва. Але як у тэатры сюжэтныя лініі ствараюць інтрыгу, так і ў рэальнасці без яе немагчыма, як і немагчыма пакінуць яе без вырашэння. Найбліжэйшую тэатральную інтрыгу чакаем 23 мая, калі адбудзецца чарговы з'езд Беларускага саюза тэатральных дзеячаў. Напярэдадні наша размова з яго старшынёй драматургам Аляксеем ДУДАРАВЫМ.**

***— Тэатр вельмі шчыльна звязаны з часам і востра адчувае яго ўплыў. Так было заўсёды, а падчас пандэміі наогул узнікла рызыка, што можа пазбавіцца публікі, сувязь з якой згубіць проста, а аднавіць — складана. У гэтым сэнсе ёсць хваляванне за беларускі тэатр і за людзей, якія яго ствараюць.***

— Не толькі пандэмія прынесла складанасці, яны пачаліся яшчэ чвэрць стагоддзя таму — з 90-х гадоў. Мне падаецца, у грамадства змянілася стаўленне не толькі да тэатра, але і да мастацтва наогул. І калі раней ты быў мастаком, артыстам, пісьменнікам, ды яшчэ членам творчага саюза, да цябе з пашанай ставіліся людзі розных відаў дзейнасці і прафесійнай прыналежнасці. Але нешта змянілася ў грамадстве. Чаму так — справа аналітыкі і часу. Да чаго гэта прывядзе, пакуль таксама незразумела. Мяне як чалавека творчага гэта непакоіць, таму што раней мастацтва арыентавала чалавечую мараль, уплывала на псіхалогію. Тэатр імкнуўся ставіцца да людзей з павагай, мы гаварылі пра арыенціры: святло ў тым баку, а цемра — у адваротным. Цяпер людзі самі разбіраюцца са сваёй мараллю, а жывая клетка звычайна шукае спакою і не хоча напружвацца — так ва ўсіх, і я не выключэнне. Але ў тэатр трэба прыходзіць і працаваць. Значна прасцей тым, хто ідзе ў тэатр, каб іх забаўлялі, каб падкідвалі тое, што можна зразумець не задумваючыся. Ёсць такая тэндэнцыя, і яна адчувальная не толькі ў Беларусі. Тэатру даводзіцца гэтаму супрацьстаяць. Прычым не толькі дзеля захавання сябе як мастацкай з'явы, але і дзеля гледачоў, якія пра гэта могуць наогул не задумвацца.

Буду пра гэта гаварыць на з'ездзе. Не ў якасці апраўдання. Лёгка выйсці і сказаць, што ў нас не робіцца, каб потым нашмат больш наабяцаць. Калі б такі чалавек знайшоўся, я першы прагаласаваў бы за яго. А потым наракаў бы на сябе: чаму ж я не дадумаўся да гэтага бяссоннымі начамі, калі задаваў сабе пытанне, што рабіць?..

***— Саюз тэатральных дзеячаў — гэта супольнасць творчых асоб, і, акрамя праблем мастацтва, іх яшчэ турбуюць пытанні персанальнага існавання...***

— Саюз — структура, якая аб'ядноўвае. Мы не паўнамоцны орган: не міністэрства тэатра, не міністэрства кінематаграфіі, не міністэрства літаратуры, каб прымаць адказныя рашэнні і ўплываць на развіццё галіны. Гэта людзі, якіх лёс паставіў займацца адной справай, і мы павінны адзін аднаго падтрымліваць. Некалі ў заснавальніцы ўсерасійскага тэатральнага таварыства Марыі Савінай спыталі: навошта гэтае аб'яднанне? А яна ў адказ сказала адно слова, якое па-руску гучыць так: «Всепомоществование». Узаемадапамога. Але чым мы можам дапамагчы? Часам можна пачуць: вось, раней Беларускі саюз тэатральных дзеячаў, напрыклад, накіроўваў на вучобу... Так, раней ён фінансаваўся грамадствам. Цяпер не фінансуецца. І можна задаваць шмат пытанняў, што мы здольныя зрабіць. Напрыклад, ці можам выдаць беларускую тэатральную энцыклапедыю? Можам. А ці можам правесці канферэнцыю з выданнем матэрыялаў? Можам. А стварыць свой тэатр можам? Можам. Але паўстае пытанне сродкаў, гэта па-першае. Па-другое, ёсць структуры, якія за гэта адказваюць.

**«На мой погляд, ёсць рэчы, якія для сапраўднага мастацтва з'яўляюцца табу, незалежна ад права на творчую свабоду. Бо людзі схільныя да салодзенькага, да кісленькага, да казытлівага і так далей. Заўсёды ёсць спакуса, што такое спадабаецца аўдыторыі. Але тады ўзнікаюць пытанні: дзеля чаго гэта ўсё?.. Куды мы рухаемся? Што будзе далей?»**



Мы грамадскае аб'яднанне. Раней, за савецкім часам, творчы саюз быў быццам незалежны ад дзяржавы. Але дзяржава давала грошы, іншым разам наўпрост з бюджэту. А іншым разам праз наш вытворча-мастацкі камбінат, які дзяржава вызваляла ад падаткаў, а тое, што павінны былі выплаціць у казну, пераходзіла на рахунак саюза. За гэта існавалі. Але гэта даўно скончылася і наўрад ці адновіцца. Цяпер у законе прапісана, што грамадскія арганізацыі не ўмешваюцца ў дзейнасць дзяржаўных структур, а дзяржаўныя органы не ўмешваюцца ў дзейнасць грамадскіх арганізацый. Можна колькі заўгодна казаць пра тое, што мы нясём культуру, але трэба разумець, што час змяніўся. Мы нічым не адрозніваемся ад іншых грамадскіх арганізацый, кожная з якіх займаецца сваёй важнай справай.

***— Цяпер час такі, калі мастацтва мяняецца, тэатр мяняецца з пункту гледжання формы падачы і прыходу для людзей. Ідзе трансфармацыя і ўнутрытэатральных суадносін. Як на гэта рэагуе тэатральная супольнасць?***

— Ёсць працэсы, на якія грамадскае аб'яднанне не можа паўплываць. Ёсць тэатр, ён нешта ставіць. Як саюз можа ўказаць некаму, што патрэбна, а што не патрэбна? Кожны тэатр — самастойная адзінка, якая сама выбірае творчы кірунак. А для іншага вызначэння ёсць дзяржаўная структура — Міністэрства культуры, якое ў сваю чаргу можа сказаць: «Калі мы палічым неабходным параіцца з творчай арганізацыяй, то зробім гэта». Таму звужэнне дзейнасці саюза ў нейкім сэнсе ёсць. Але ўзаемадапамогу ніхто не адмяняў.

***— Каб рэалізаваць узаемадапамогу, трэба ўсё ж такі мець сродкі. Разлік на ўнёскі?***

— Мы існуём за кошт унёскаў і за кошт таго, што зрабілі нашы папярэднікі, у тым ліку дзяржава. У нас ёсць камбінат, які цяпер працуе як звычайнае прадпрыемства. Ён нас падтрымлівае, але сціпла. Дзякуй Богу, што будынак нашага тэатральнага Дома творчасці ў Астрашыцкім гарадку набыла дзяржава праз аўкцыён. Атрыманыя грошы не праядаем, яны ў надзейным банку. БСТД не жыве на шырокую нагу. Структуру саюза мы таксама аптымізавалі, але гэта немагчыма рабіць бясконца.

Мы патрэбныя адно аднаму. І неабходна нейкая структура, пра якую могуць забыць усе, акрамя дзеячаў тэатра. Яшчэ напачатку свайго старшынства я даў распараджэнне супрацоўнікам, каб павіншавалі са святам усіх ветэранаў тэатра. Праз два тыдні атрымаў падзяку аднаго заслужанага артыста РСФСР. Скончылася творчае жыццё, прайшоў час, чалавек думаў, што пра яго забыліся... Я тады быў усхваляваны. Аднак, каб



нават паштоўку паслаць, трэба мець хоць бы капейчыну. А ўнёскі ў нас умоўныя: з чаго іх плаціць, напрыклад, нашым пенсіянерам ці маладым людзям, якія толькі пачынаюць працаваць? Ды нават маючы заробак, шмат хто падумае, што гэтыя грошы былі б не лішнія. І часта паўстае пытанне, на якое цяжка знайсці адказ: «А што мне дае саюз?..»

Некаторыя разважаюць так: мы ж нясём культуру ў масы, і, адпаведна, нам за гэта ўсе павінны. Адкуль усё бярэцца, творчых людзей не асабліва цікавіць. Таму даводзіцца займацца матэрыяльным, гаспадаркай. Акрамя таго, па інерцыі думаюць, што калі саюз — творчае аб'яднанне, то ён павінен займацца творчасцю. Творчасць — у тэатрах. Творчасць — у майстэрнях. Творчасць — за сталом, калі чалавек піша п'есу... Ну як можна дапамагчы акцёру ці актрысе, напрыклад, атрымаць ролю ці ўвасобіць яе і стаць зоркай?.. Ёсць пытанні ў жыцці тэатраў, на якія саюз уплываць не можа.

**«Раней мастацтва арыентавала чалавечую мараль, уплывала на псіхалогію. Тэатр імкнуўся ставіцца да людзей з павагай, мы гаварылі пра арыенціры: святло ў тым баку, а цемра — у адваротным. Цяпер людзі самі разбіраюцца са сваёй мараллю, а жывая клетка звычайна шукае спакою і не хоча напружвацца — так ва ўсіх, і я не выключэнне».**

Але можа звярнуць увагу на годную працу. Дзеля гэтага і быў заснаваны наш прыз «Крыштальная Паўлінка». Першы атрымала народная артыстка СССР Стэфанія Станюта. На жаль, з вясны 2020 года, калі пачалася пандэмія, мы свае крыштальныя прызы не ўручылі і пасля наогул не прысуджалі, у тым ліку «Крыштальнага анёлка», «Крыштальную зорку», «Крыштальную кветку». А прыз «Натхненне» ў межах Нацыянальнай тэатральнай прэміі атрымала Вераніка Вінэль, дырэктар Бабруйскага тэатра драмы імя Дуніна-Марцінкевіча. Ён уручаецца арганізатарам тэатральнай справы.

***— Тэатр застаецца сёння сродкам камунікацыі для самых розных людзей...***

— ...І яго трэба захоўваць. Але ступень яго ўплыву звужаецца з розных прычын. Раней казалі, што тэатру пагражае распаўсюджанне радыё, але я ў гэта не верыў ніколі. З'явіўся тэлевізар — і тут не верыў, што тэатр знікне. А вось калі з'явіўся інтэрнэт, смартфоны — дык там жа цяпер любы спектакль можна паглядзець...

***— Некаторыя тэатры ўсвядомлена выкладваюць запісы сваіх пастановак.***

— Гэта ад адчаю: глядзіце, што мы зрабілі, можа, прыйдзеце паглядзець жывое. Таму змагацца за гледача трэба, але, мабыць, па ўзросце я аптымістам не з'яўляюся...

***— Моладзь скептычна ставіцца да жывых кантактаў з мастацтвам, пакуль не схадзіла ў тэатр.***

— Памятаю, у Купалаўскім тэатры ішоў спектакль «Кім». Дык да мяне даходзілі чуткі з асяродка падлеткаў: маўляў, што размаўляць з тымі, хто не паглядзеў «Кім»? Мне як аўтару было прыемна, але гэта здарылася не ўчора, а больш за дзесяць гадоў таму. Яны цяпер падрастаюць незразумелыя, і проста так заклікаць ці тым больш заганяць у тэатр нельга. Трэба выкарыстоўваць багата «штучак-дручак», якія больш даступныя і якімі можна карыстацца там, дзе знаходзішся, і тады, калі хочаш. А тэатр — гэта ўсё-такі нейкі акт, да якога трэба саспець.

***— Часта глядач вучыцца разумець тэатр паралельна з тым, як тэатр спрабуе зразумець сябе: дзе ён знаходзіцца, на што здольны і якім чынам можа сёння размаўляць з гледачом. Хто для каго арыенцір у гэтым працэсе?***

— Некалі мы глядзелі адзін спектакль разам з выдатным артыстам Кірылам Лаўровым, а пасля да яго кінуліся карэспандэнты: як вам?... «Не спадабалася» — «Ой, вы адсталі...» Адразу ж прагучаў адказ: «Я адстаў, але даганяць будзеце вы». Лепш не скажаш.

Мне давялося быць на некаторых спектаклях, якія я б не глядзеў. Але я бачыў, што гледачу гэта падабаецца. Тут складаныя ўзаемаадносіны. І ёсць пытанне шчырасці і сумлення мастацтва. На мой погляд, ёсць рэчы, якія для сапраўднага мастацтва з'яўляюцца табу, незалежна ад права на творчую свабоду. Бо людзі схільныя да салодзенькага, да кісленькага, да казытлівага і так далей. Заўсёды ёсць спакуса, што такое спадабаецца аўдыторыі. Але тады ўзнікаюць пытанні: дзеля чаго гэта ўсё?.. Куды мы рухаемся? Што будзе далей? Толькі з'яўляючыся аптымістам, можна сказаць: ўсё будзе добра. Але будзе як будзе.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

К@нтыненты

# ШТАТНЫ РАЗЛАД

## Чаму ЗША ахапіў гістарычны крызіс?



**Амерыканская эканоміка ў хуткім часе адчуе на сабе эфект стагфляцыі. Пра гэта заявіў кіраўнік інвестыцыйнай кампаніі Gramercy Funds Management Мухамед аль-Арыян, паведаміла ТАСС. Па меркаванні эксперта, у эканоміцы ЗША ўзрастае верагоднасць рэцэсіі. У найбліжэйшы час краіна адчуе на сабе эфект адразу двух негатыўных фактараў — росту інфляцыі і запавольвання эканамічнага развіцця. Эксперт адзначае, што частка віны ляжыць на Федэральнай рэзервовай сістэме ЗША, якая недаацаніла становішча ў краіне і першапачаткова паставілася да інфляцыі як да часовай з'явы. У красавіку яна дасягнула 8,3 працэнта. Пры гэтым ВУП краіны ў першым квартале зменшыўся на 1,4 працэнта. Патавай сітуацыі шмат у чым паспрыялі бязглуздыя дзеянні ўлад на чале з прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам. Чаму ЗША ахапіў гістарычны крызіс, чаго чакаць надалей?**

### БАЛЮЧАЯ ПАСАДКА

Спроба прэзідэнта ЗША Джо Байдэна знізіць вастрыню праблемы інфляцыі шляхам распродажу нафтавых рэзерваў церпіць крах. Рэзервы ўпалі да мінімуму з 1987 года, але кошт нафты ўзляцеў да ўзроўню сярэдзіны красавіка, а ф'ючарсы на бензін — да гістарычнага максімуму, заўважае expert.ru. У канцы сакавіка адміністрацыя прэзідэнта ЗША, як вядома, аб'явіла, што на працягу паўгода на рынак будзе выкідвацца мільён барэляў у дзень. Гэта частка праграмы, накіраванай на ўціхамірванне інфляцыі. Тады былі вядомыя толькі даныя за люты (7,9 працэнта), але і яны выклікалі вялікае напружанне ў Белым доме. Потым былі 8,5 працэнта ў сакавіку і 8,3 працэнта ў красавіку. Але рознічныя цэны на бензін ужо ў сакавіку перапісалі гістарычны максімум, узляцеўшы да 4,17 долара за галон.

Кошт нафты пачаў рэгулярна ўзлятаць не толькі вышэй за 100 долараў, але і вышэй за $110 за барэль. Гэта было прадказальна ва ўмовах збояў паставак, недастатковай здабычы нафты ў краіне і незбалансаванасці попыту. На такім фоне кошт бензіну на амерыканскіх аўтазапраўках у ЗША пачаў расці і ў маі зноў пачаў абнаўляць адзін гістарычны максімум за другім. Але ўлады ЗША, зразумела, ад распродажу нафты адмаўляцца не маюць намеру. Аднак, на думку трэйдараў, улічваючы страты ад папярэдніх падобных праграм, праз 4,5 месяца (пасля завяршэння гэтага распродажу) краіна доўга не вырашыцца на сур'ёзныя інтэрвенцыі на нафтавым рынку.

ЗША перажываюць найскладанейшы энергетычны крызіс за апошнія 50 гадоў, і ў адміністрацыі прэзідэнта Джо Байдэна няма стратэгіі па выхадзе з такой сітуацыі. Пра гэта заявіў прэзідэнт Асацыяцыі нафты і газу ЗША Цім Сцюарт, паведамляе тэлеканал Fox News. «Цэны на дызельнае паліва і бензін знаходзяцца на рэкордна высокім узроўні, а іх запасы — на рэкордна нізкім узроўні», — паведаміў эксперт. Паводле яго слоў, адміністрацыя Джо Байдэна нічога не робіць для вырашэння праблемы. «І, шчыра кажучы, усе дзеянні, якія яны пачынаюць, контрпрадукцыйныя для тых з нас, хто спрабуе вырашыць гэту праблему», — адзначыў Цім Сцюарт.

Прайшло ўжо 300 дзён з таго часу, як прэзідэнт ЗША Джо Байдэн заявіў, што высокая інфляцыя будзе часовай з'явай. Аднак цэны ў ЗША працягваюць біць чарговыя рэкорды. З гэтага можна зрабіць выснову, што амерыканскі лідар прайграў бітву з інфляцыяй, піша часопіс Newsweek. 19 ліпеня мінулага года Джо Байдэн, выступаючы ў Белым доме, заявіў, што значны рост цэн, які адбыўся на фоне аднаўлення амерыканскай эканомікі, не працягнецца доўга. «Некаторыя людзі выказалі занепакоенасць тым, што гэта можа быць прыкметай устойлівай інфляцыі. Але мы так не думаем. Нашы эксперты лічаць і даныя паказваюць, што рост цэн, які мы назіраем, быў чаканы і ён часовы», — супакойваў амерыканскі лідар.

Гадавы ўзровень інфляцыі ў ліпені мінулага года склаў 5,4 працэнта. У той час хадзілі чуткі, што інфляцыя дасягнула піка. Аднак праз 300 дзён пасля каментарыяў Байдэна цэны працягваюць расці, а гадавы ўзровень інфляцыі нават вышэйшы, чым мінулым летам. Летась у ліпені Байдэн казаў, што Федэральная рэзервовая сістэма ЗША незалежная і «павінна рабіць любыя крокі, якія палічыць неабходнымі для падтрымкі моцнага і ўстойлівага аднаўлення эканомікі».



4 мая ФРС аб'явіла аб павышэнні працэнтных ставак на паўпрацэнта і, як чакаецца, зробіць яшчэ два павышэнні на паўпрацэнта ў чэрвені і ліпені. Мэтавы паказчык інфляцыі цэнтрабанка складае два працэнты ў гадавым вылічэнні. Кіраўнік ФРС Джэром Паўэл заявіў, што дасягненне гэтай мэты можа аказацца балючым. «Працэс зніжэння інфляцыі да двух працэнтаў таксама будзе спалучаны з некаторым болем, але самым балючым будзе тое, што мы не зможам справіцца з гэтым, і інфляцыя замацуецца ў эканоміцы на высокім узроўні, — заявіў кіраўнік ФРС. — Ці зможам мы выканаць мяккую пасадку або не, насамрэч можа залежаць ад фактараў, якія мы не кантралюем».

### РАСКОЛ І НЯНАВІСЦЬ

Сярод усяго іншага ў ЗША фіксуецца востры дэфіцыт дзіцячых сумесяў у сувязі з праблемамі ў ланцужках паставак і масавым адкліканнем гэтай прадукцыі з рынку. Па звестках кампаніі Datasembly, якая сабрала інфармацыю ад больш чым 11 тысяч рознічных пунктаў, у пачатку мая аб'ём дзіцячых сумесяў на складах быў ніжэйшы на 43 працэнты ад сярэдняга ўзроўню. Рэспубліканцы крытыкуюць адміністрацыю дэмакрата Байдэна за запозненыя рашэнні, хоць аб патэнцыйных праблемах было вядома яшчэ напрыканцы мінулага года. Сітуацыя на фоне высокай інфляцыі вельмі негатыўна ўплывае на рэйтынг папулярнасці амерыканскага лідара і яго аднапартыйцаў.

Агульнанацыянальны недахоп дзіцячага харчавання прывёў да шпіталізацыі немаўлят у горадзе Тэнэсі, паведаміў часопіс Hill. Як расказаў загадчык аддзялення гастраэнтэралогіі дзіцячай бальніцы «Ле Бонер» Марк Коркінс, гэтыя дзеці мелі праблемы са здароўем і ім патрабавалася спецыяльнае дыетычнае харчаванне. Ён адзначыў, што немаўлятам спатрэбілася шпіталізацыя, таму што бацькі на працягу некалькіх тыдняў спрабавалі знайсці дзіцячыя сумесі для сваіх дзяцей. Дэфіцыт пагоршыўся праблемамі з ланцужком паставак у спалучэнні з масавым адкліканнем прадукцыі ў Abbott Nutrition, аднаго з вядучых вытворцаў дзіцячых сумесяў. Раней у адміністрацыі ЗША заявілі, што з лютага працуюць над вырашэннем праблемы дэфіцыту дзіцячых сумесяў у крамах.

Амерыка праводзіць шматлікія войны, якія звычайна абазначаюцца крыжовымі паходамі ў імя свабоды, нават у тым выпадку, калі ў іх аснове ляжаць відавочныя імперскія амбіцыі Вашынгтона, заявіў аглядальнік амерыканскага выдання The American Conservative гісторык Эндру Басевіч, паведаміла РІА «Навіны». Ён зазначыў, што амерыканскім уладам трэба спачатку разабрацца з уласнымі праблемамі, якія вядуць да расколу амерыканскага грамадства. У прыватнасці, з пытаннямі злачыннасці, іміграцыі, валодання зброяй, кліматычнага крызісу. На думку эксперта, Джо Байдэн аказаўся не гатовы да абавязацельстваў, якія былі на яго ўскладзены. Эндру Басевіч ахарактарызаваў цяперашняга прэзідэнта ЗША як неэфектыўнага, схільнага да памылак і не здольнага даць краіне новы імпульс.

Амерыканскі вынаходнік і мільярдэр, заснавальнік кампаній SpaceX і Tesla Ілан Маск заявіў, што Дэмакратычная партыя ЗША нясе раскол і нянавісць грамадству. Аб гэтым ён напісаў у сваім акаўнце ў Twitter. Ён адзначыў, што не будзе ў далейшым падтрымліваць дэмакратаў і мае намер галасаваць за рэспубліканцаў. Пры гэтым Ілан Маск лічыць, што яго словы не застануцца без увагі з боку партыі прэзідэнта Джо Байдэна. «Цяпер глядзіце, як разгортваецца іх брудная кампанія супраць мяне», — напісаў Маск. Раней Ілан Маск абрынуўся з крытыкай на Белы дом і самога прэзідэнта за іх «поспехі» па кіраўніцтве краінай.

Рэйтынг Байдэна ў ЗША імкліва зваліўся да 39 працэнтаў, а да новых выбараў — усяго паўгода. Пры гэтым «менавіта глупства ўрада ЗША і няўмелае кіраванне эканомікай сталі прычынай цяжкасцяў», піша кітайскае выданне Global Times. У матэрыяле ўдакладняецца, што цэны на самыя розныя тавары ў амерыканскіх супермаркетах працягваюць расці. Раней амерыканскі палітычны аглядальнік канала Fox News Такер Карлсан назваў прэзідэнта ЗША «беспрэцэдэнтнай катастрофай».

Ён абвінаваціў амерыканскага лідара ў абвальванні фондавага рынку, недахопе харчавання, росце колькасці забойстваў, інфляцыі.

Экс-лідар ЗША Дональд Трамп на мітынгу сваіх прыхільнікаў зноў праехаўся па дзеючым прэзідэнце краіны Джо Байдэне. Ад Трампа не засталіся незаўважанымі дзіўныя рухі Байдэна ў апошнія дні, калі кіраўнік ЗША спрабаваў паціскаць рукі нябачным істотам. Трамп пад апладысменты сваіх адэптаў заявіў напярэдадні: «На жаль, у нас прэзідэнт, які абсалютна не разумее, што адбываецца. Ён паціскае рукі паветру. Ён разгублена ходзіць кругамі. Я скажу вам: няма нічога добрага ў тым, каб прытрымлівацца загадаў велікоднага труса». Дональд Трамп сыранізаваў у адрас Белага дома: «Ну наймiце тады гэтага труса, няхай ён працуе». Як вядома, раней Джо Байдэна «захапіла» роставая фігура велікоднага труса, калі ён пачаў незапланавана размаўляць з прэсай. У касцюме труса была супрацоўніца Белага дома Меган Хейс, якая, матляючы гіганцкімі вушамі, адвяла «соннага Джо» ад журналістаў.

### РАЗВІТАННЕ З ДОЛАРАМ

Амерыканскія палітыкі сваімі дзеяннямі самі падштурхоўваюць сусветную эканоміку да адмовы ад долара. Такой думкай у рамках праекта «У тэме» на YouTube-канале БелТА падзяліўся палітолаг, лідар руху «Сутнасць часу» ў Расіі Сяргей Кургінян. Адказваючы на пытанне аб магчымасці адмовы ад долара ў якасці сусветнай валюты, палітолаг заявіў, што гэта магчыма ўпершыню ў гісторыі. «Пры гэтым самі амерыканцы падштурхоўваюць свет да гэтага. Ніхто не прымушаў іх аб'яўляць Кітай ворагам і ствараць нейкае супрацьстаянне дэмакратыі і аўтарытарызму. Са сваёй дзікай кампаніяй русафобіі яны парушылі ўсе правілы сваёй жа гульні. Хіба па правілах забіраць золатавалютныя рэзервы? Што гэта за правіла — экспрапрыяцыя? Так гэта называецца. У такіх умовах долар проста не можа быць легітымнай сусветнай валютай. І ён будзе сыходзіць», — заявіў Сяргей Кургінян. Ён дадаў, што гэта не адбудзецца аўтаматычна, але сусветная эканоміка рухаецца ў гэты бок.

Сяргей Кургінян падзяліўся прагнозамі ўплыву гэтага працэсу на амерыканскую эканоміку: «Яна пойдзе на трэцяе ці чацвёртае месца ў свеце. Гэта здарыцца адразу пасля таго, як у ЗША перастануць друкаваць глабальную сусветную валюту. А насельніцтва ў іх вельмі раскормленае. І яно пачне бунтаваць. Насамрэч гэта ўжо адбываецца. Але пачнецца яшчэ большы бунт. Выйдуць яны з яго ў дыктатуру ці развал краіны, сказаць складана. Асабіста я думаю, што ўсё скончыцца дыктатурай. І яна будзе вельмі лютай».

Развіваючы тэму наступстваў адмовы ад долара на абстаноўку ў Злучаных Штатах Амерыкі, палітолаг выказаў меркаванне: «Да ўлады можа прыйсці хто-небудзь, хто вырашыць скарыстацца ядзернай зброяй. Ці гэта будзе які-небудзь прадстаўнік цемнаскурай большасці, які ў вялікіх колькасцях прымае наркотыкі. Мала што можа быць. У хаосе паняцця лінейных прагнозаў не існуе. Гэта нерэгулюемы працэс, які пачнецца пасля краху долара. Ніякай ідыліі я не бачу. Гэта будзе вайна ўсіх супраць усіх», — рэзюмаваў Сяргей Кургінян.

**Захар БУРАК.**

**Даслоўна**

### «АД АМЕРЫКАНСКАЙ ПЯТЛІ СТАМІЛІСЯ ЎСЕ»

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі з нагоды 77-й гадавіны Вялікай Перамогі. «Усе спробы задушыць нас робяць толькі мацнейшымі і натхняюць іншых. Таму што на беларусаў, расіян, якія зноў вядуць барацьбу з гэтым сусветным злом, глядзяць мільярды людзей. Кітай, Індыя, краіны Лацінскай Амерыкі, Афрыкі, арабскія дзяржавы. Ад амерыканскай пятлі стаміліся ўсе!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што большасць грамадзян планеты выступаюць за новы, справядлівы свет без дыскрымінацыі і санкцый, у якім усе народы свабодныя і раўнапраўныя, а пытанні і праблемы вырашаюцца шляхам дыялогу.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Цярпенне і праца, а таксама поўны эмацыянальны спакой дазволяць захаваць ваша здароўе і нервовую сістэму. Нямала цікавых ідэй узнікне ў сераду. Усё будзе спорыцца ў руках, і вы проста гуляючы справіцеся са шматлікімі назапашанымі справамі. У пятніцу, перш чым на штосьці вырашыцца, адмоўцеся ад ілюзій і паспрабуйце ўбачыць сітуацыю, якая склалася, збоку.

**ЦЯЛЕЦ.** Ужо даўно прайшлі хвалюючыя падзеі, час крыху расслабіцца, хоць яшчэ шмат незавершаных спраў. Збярыцеся, і ў адзіным творчым парыве завяршыце іх зараз — як прыемна будзе пахваліць сябе за гэта. Паспрабуйце ўладжваць узніклыя сямейныя канфлікты мірным шляхам. Вас могуць турбаваць дробязі, паспрабуйце не раздражняцца і ўсвядоміць, што часам з дробязяў пачынаюцца вялікія справы. Вельмі хутка вам абавязкова ўсміхнецца спадарыня Фартуна.

**БЛІЗНЯТЫ.** Пастарайцеся максімальна распланаваць тыдзень, тады зможаце ўсё паспець. Вас чакае нямала спраў і праектаў, якія дазволяць добра зарабіць. Каханне акрыляе. І ваш добры настрой парадуе не толькі вас саміх, але і ўсіх, хто апынецца побач. Актыўны адпачынак, паездкі, новыя знаёмствы і вандраванні пойдуць вам на карысць.

**РАК.** На гэтым тыдні зебра лёсу вырашыць падбрыкнуць, зрэшты, горш ад гэтага не стане. Вы здолееце пераадолець усе перашкоды. У некаторых выпадках варта скарыстацца незапланаванай дапамогай сяброў або калег, што значна паскорыць працу. Тыдзень абяцае поспех практычна ва ўсіх пачынаннях. Прысвяціце пятніцу і суботу навядзенню дома парадку, прыгажосці і чысціні.

**ЛЕЎ.** Тыдзень насычаны падзеямі, стасункамі з сябрамі, кароткімі ўдалымі паездкамі. Адзін з новых знаёмых можа аказацца вельмі ўплывовай персонай, што, безумоўна, пойдзе вам толькі на карысць. Калі ў аўторак вырашыце, што адлюстраванне ў люстэрку псуе вам настрой, значыць, прыйшоў час заняцца сабой: зрабіць новую стрыжку, пафарбаваць валасы, перагледзець гардэроб, запісацца на спорт. У пятніцу дасціпнасць дапаможа вам знайсці выйсце з цяжкай сітуацыі.

**ДЗЕВА.** У найбліжэйшыя дні не варта глыбока акунацца нават ва ўласныя праблемы, не кажучы ўжо пра чужыя. Імі і зусім займацца не трэба. Час згубіце, але дзякуй вам не скажуць. Зрэшты, нічога асабліва засмучальнага тыдзень не прынясе, а дробныя непрыемнасці лепш забыць адразу. Некаторыя падзеі на працы не выклічуць у вас асаблівага энтузіязму, але казаць пра гэта ўслых не варта. У пятніцу пажадана на час адключыцца ад спраў і адпачыць, у гэты дзень вашы ідэі могуць аказацца незапатрабаванымі, што крыўдна, затое перадышка ў справах дазволіць пазбегнуць рознагалоссяў.

**ШАЛІ.** Вам проста неабходна змена абстаноўкі. Так што, калі ёсць магчымасць, вазьміце невялікі адпачынак. Або напрасіцеся ў камандзіроўку. Аднак ва ўсім захоўвайце меру і разумнасць. Асабліва ў ежы і ў забавах. Пастарайцеся больш мець зносіны і выходзіць у свет. Вы прыцягваеце да сябе людзей актыўнасцю і адкрытасцю. Гэты тыдзень — выдатны час для творчасці.

**СКАРПІЁН.** Начальства падтрымае вашы ідэі і павысіць заробак. Зрэшты, вы шмат працавалі і па праве заслужылі паўнавартасны адпачынак. Вас чакаюць прыемныя падзеі ў асабістым жыцці. Вы пазбавіцеся чагосьці непатрэбнага і таго, што надакучыла, і зможаце быць разам з тым, каго любіце. У сярэдзіне тыдня падзеі, якія змяняюць адна адну, будуць патрабаваць вашай увагі і ўдзелу, а таксама рашучасці і хуткай рэакцыі. Калі вы ў эмацыянальным парыве прызнаецеся ў каханні, гэта будзе вельмі правільны крок.

**СТРАЛЕЦ.** Вам неабходна зараз захоўваць эмацыянальную раўнавагу і спакойна паставіцца да перашкод, якія ўзнікаюць на вашым шляху. З начальствам пажадана не спрачацца, а вось падначаленых неабходна трымаць у строгасці. І тады вас чакае поспех. Аднак непажадана, каб вы бралі ўдзел у фінансавай гонцы, камусьці з сапернікаў ці з начальнікаў наўрад ці спадабаецца гэта. У пятніцу пастарайцеся ўдзяліць больш увагі блізкім. У выхадныя лепш не ўступаць у дыскусію са сваякамі, каб не пасварыцца.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні вам неабходна паказаць сябе, ды так, каб вас заўважылі і падтрымалі тыя, ад каго вы маглі б атрымаць дапамогу ў найбліжэйшы час. Не саромейцеся пры выпадку карэктна падкрэсліць вашу незаменнасць на працы. Праявіце актыўнасць і прыязнасць. Вам будзе патрэбна інфармацыя, а ўдалы спосаб яе атрымаць — шчыра пагаварыць з калегамі. У пятніцу не варта планаваць нічога сур'ёзнага, лепш разбярыцеся з незавершанымі дробнымі справамі.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні спадарыня Фартуна можа быць добразычлівая ў сферы грамадскай дзейнасці і на працы. Аднак не дазваляйце сябе эксплуатаваць, хоць і не хавайце свае здольнасці, выяўляйце іх у поўнай меры. Менш верце ў абяцанні і аб'ектыўна разлічвайце свае сілы і магчымасці. Варта прызнаць памылкі ў адносінах з другой палавінкай, тады ёсць шанец выправіць іх.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні асабліва важна не мітусіцца. Засяродзьцеся, разгледзьце сітуацыю, якая склалася, з усіх бакоў — гэта сэканоміць вам час і сілы, якія вы патрацілі б на бессэнсоўныя, але працаёмкія дзеянні. У асабістым жыцці не выключаны перамены, разрывы, разводы. У суботу вельмі непажадана працаваць, адпачынак можа быць актыўным, але ні ў якім разе не працоўным.

Даты | Падзеі | Людзі

**21 МАЯ**

У краіне

**1522** год — мястэчка Івянец (сёння — гарадскі пасёлак Валожынскага раёна) упершыню згадваецца як населены пункт Мінскага павета ВКЛ, уладанне Салагубаў, дзякуючы якім у пачатку XVIII ст. стаў цэнтрам графства. Графскі род валодаў радавым гербам «Праўдзіч», які паслужыў асновай для сучаснага гарадскога герба.

**1682** год — нарадзіўся Юрый Трубніцкі, магілёўскі летапісец. Адзін з аўтараў «Магілёўскай хронікі» — помніка гарадскога летапісання XVII—XIX стагоддзяў, апошняга беларускага летапіснага збору. Падрабязна апісаў падзеі 1710-х гадоў, перыяду Паўночнай вайны 1700—1721 гадоў, даў яркія вобразы гістарычных асоб таго часу — Пятра I, Карла XII, Меншыкава, Мазепы, беларускага шляхціца Сініцкага і інш. Хроніка мае высокую літаратурную каштоўнасць. Зараз захоўваецца ў Санкт-Пецярбургу ў Публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына.

**1740** год — адбылася прэм'ера Нясвіжскага прыдворнага тэатра Радзівілаў (прыгонны тэатр праіснаваў каля 50 гадоў). Былі пастаўлены творы Францішкі Уршулі Радзівіл: камедыі «Дасціпнае каханне», «Гульня Фартуны», трагедыя «Золата ў агні» і іншыя. Спектаклі ставіліся на польскай, італьянскай, нямецкай і французскай мовах.

**1877** год — нарадзіўся Сяргей Міхеевіч Мелкіх, тэрапеўт, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Займаўся вывучэннем злаякасных анемій і пухлін, малярыі, лейкозаў, прафілактыкай і лячэннем туберкулёзу лёгкіх. Аўтар больш чым 10 навуковых прац, у тым ліку адной манаграфіі.

У свеце

**1471** год — нарадзіўся Альбрэхт Дзюрэр, нямецкі жывапісец, гравёр і графік, адзін з найвялікшых майстроў заходнееўрапейскага Рэнесансу.



**1904** год — у Парыжы заснавана ФІФА — Міжнародная федэрацыя футбола.

**1937** год — нарадзілася Сафіко Міхайлаўна Чыаўрэлі, грузінская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Грузінскай ССР і Армянскай ССР. Здымалася ў фільмах «Не бядуй!», «Мелодыі Верыйскага квартала», «Шукайце жанчыну» і іншых.

**1937** год — высадзілася на лёд першая савецкая навукова-даследчая дрэйфуючая станцыя «Паўночны полюс-1» пад кіраўніцтвам І. Д. Папаніна.

**1942** год — Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР для ваеннаслужачых гвардзейскіх часцей і злучэнняў Чырвонай Арміі заснаваны нагрудны знак «Гвардыя», а для гвардзейцаў ВМФ — прамавугольная пласцінка з муаравай стужкай аранжавага колеру з чорнымі падоўжнымі палосамі; адначасова былі ўведзены гвардзейскія званні.

**1944** год — на плебісцыце ў Ісландыі жыхары падтрымалі рашэнне парламента аб аддзяленні ад Даніі, 17 чэрвеня была абвешчана рэспубліка.

Так гаварыў...

**ФРЭНСІС БЭКАН:**

*«Няма нічога страшнейшага за сам страх».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.58 | 21.15 | 16.17 |
| Віцебск | 4.41 | 21.12 | 16.31 |
| Магілёў | 4.48 | 21.06 | 16.18 |
| Гомель | 4.52 | 20.54 | 16.02 |
| Гродна | 5.15 | 21.29 | 16.14 |
| Брэст | 5.23 | 21.22 | 15.59 |

### Месяц

***Поўня 16 мая.***
***Месяц у сузор'і Вадаліва.***

### Імяніны

***Пр.** Арсенія, Івана, Пімена.*
***К.** Канстанцыі, Монікі, Валенцiя, Віктара, Даната, Караля, Цімафея, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Хлопчык прыйшоў дадому з вуліцы. Мама яго пытаецца:**
**— Чаму ў цябе ўсе рукі чорныя, а два пальцы чыстыя?**
**— Мяне хлопцы свістаць вучылі!**

— Ты мяне кахаеш?
— Вельмі, вельмі, вельмі, вельмі моцна не хачу адказваць на гэтае пытанне.

**Што значыць я несамастойны і безадказны? Я сам выхоўваю ката, мне ў гэтым ніхто не дапамагае.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1229.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 20 мая 2022 года.